# ЗМІЦЕР САСНОЎСКІ

# Orden Vita
# Ордэн Віта

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

Зміцер Сасноўскі

# ORDEN VITA. ОРДЭН ВІТА

Памёр кароль. Каб абраць новага, на каня паклалі меч, дзіду і пусцілі ў свет. Якога знойдзе вершніка, таго каралём і прызнаюць. Конь, урэшце, стаў на калені перад старым, які віў са скуры папругі. І назвалі караля Віт.
***Паданне з-пад Смаленску.***

Багата часу таму, нейкі ваяр, званы Вітам, ішоў з войскам і меў такую моц, што, не патрабуючы чужой дапамогі, сам сабе дарогі церабіў, балоты каменямі закідваў, на рэках масты будаваў, і пракладаў сваю дарогу па сонцу.
***Паданне з Барысаўскага павету.***

Князь великии Витовт держал великое княжене Литовское и Руское и иныи многии земли. Которыи земли на востоце або на западе были, кланялися силному господарю великому князю Витовту. И князь великыи Витовт у великои славе и у великои чти пребывал по всим землям.
***“Похвала о великом князи Витовте”, 1430 г.***

В лето 1398 бысть побоище князю великому Витовту з Темир-Куклуем. И бысть бой велик и попусти бог татаром. Князь же великий побеже во мале дружине.
***Супрасльскі летапіс, XVI ст.***

A kniaziu welikomu Witoltu tohdy derżaczy Łuczesk y wsiu Wołynskuiu zemlu, a w Litowskoy zemli otczyznu swoiu, y było iemu nużno y welmi bidno widety to, czoho pered tym ne bywało w Litowskoy zemli: storonnym władeiuczy Welikim kniażenem Litowskim. Tohdy wczynił rady z mnohimi kniazi y pany litowskimi. Tohda bo Skirgayło otiechawszy ko Połocku, a kniaź weliki Witolt pryde ko Wilni, chotiaczy zasesty, a kniahinia welikaia ieho Anna była tohda w Horodne.
***Kronika Polska, Litewska, Żmodzka y wzystkiey Rusi***

*Macieia Striykowskiego, 1582 r.*

* * *

Паляванне было ўдалым. Птушак і дзічыны набілі столькі, што паляўнічыя трокі напоўнілі да верху. Князь цешыўся сваім спрытам. Гетман, маршалак, ахоўнікі, лоўчыя, усе навокал непрыкметна, але ўважліва сачылі за кожным ягоным рухам. Як трапна ён цаляў у птушак, як заваліў дзве казулі. Усе бачылі ягоны моцны стан і трывалы ваяўнічы настрой. Гэта лепшы сродак пазбегнуць змоваў – трымаць асабісты аўтарытэт сярод дружыны і бездакорную веру між дворных. Толькі так у сквапныя душы суседзяў магчыма пасяліць сімвал сваёй моцы і перакананне ў адданасці атачэння.

Конь крочыў паволі. Увесь мокры. Яшчэ не адпачыў ад гойсання па лесе. Пасля шалу палявання ахінула прыемная стома.

– Пане Вітольдзе, мо прыпынак? – запытаў харуговы ахоўнай дружыны.

Князь кіўнуў.

– Шукаць месца! – панцырны далонню накіроўваў віжаў у розныя напрамкі.

Млосна балелі плечы ад стральбы з лука, пачыналі ныць ногі і спіна. Падзеі гэтага дня былі падобныя да старой гісторыі, калі ягоны славуты дзед Гедымін набіў дзічынай свае трокі і на месцы таго ўдалага палявання заснаваў замак. А назву даў у гонар тых самых поўных паляўнічых торбаў – Трокі. Вось і зараз, як калісьці Гедымін, ён ехаў на кані задаволены сабой і сваімі людзьмі. І ўсміхаўся дзівоснаму, але ўжо трохі забытаму пачуццю – гэта было чаканне незвычайнай падзеі. Такое пачуццё рэдка падманвала...

Першая пара віжаў вярнулася хутка і правяла да

маляўнічай паляны над стромкім рачным абрывам. Дружыннікі атачылі месца, на другім беразе ўжо стаяла вершная варта. Астатнім пратрубілі “вяртанне”. Вакол у звыклых клопатах заварушылася кіпа дворных: абозныя пачалі рыхтаваць бяседу, пахолкі распалілі вогнішча і расклалі футры, лоўчыя спрытна чысцілі качак. На стому пітны мёд наклаўся хутка і прыемна. Нават падчашы захістаўся і пад агульны смех макнуў сваю чорную бараду ў мядовы цэбар. Завесяленыя маршалак і гетман завялі песню пра бітву пад Дуброўнам.

Цікава, што менавіта на такім паляўнічым адпачынку пасля ўжывання пітнога мёду Гедымін прысніў сон пра жалезную ваўчыцу... Ад гэтых думак мацней заныла адчуванне надыходу новага.

Прыскакалі віжы, нешта даклалі. Харуговы наблізіўся да вогнішча:

– Васпане, выведнікі напаткалі старую хаціну ў гушчары. Рэшткі паганцаў. Зёлы, грыбы, чарапкі і яшчэ нейкія брыдоты.

– А ці не зазірнуць нам да нячыстай сілы ў госці! – роўкнуў захмялелы маршалак. – Як хрысціяне і рыцары мусім дбаць пра чысціню нашых уладанняў!

– Рацыю маеш, пане Андрэю! – гаркнуў няроўным голасам гетман. – Паедзем, пазнаёмімся. Ваяры Хрыстовы да твару паганых!

Большасць прысутных вояў прыкметна спахмурнела і ўпотай скіравала цікаўныя позіркі на князя...

Пахла балотам. Спрэс парослая мохам паўзямлянка амаль злілася з лесам. Цішыня. Акрамя галасоў птушак вушы гасцей не злавілі ніводнага ўскоснага гуку.

Мечнікі моўчкі ачапілі месца. Харуговы паказаў

дружыннікам на хаціну. З выцягнутымі кінжаламі яны схапілі дзверы і шмарганулі так, што тыя бразнуліся на зямлю. Ахоўнікі шмыганулі ў прагал і праз хвіліну адтуль пачулася: “Вольна!”. Харуговы, а потым і князь, спусціліся з коней і прасунуліся пад нізкую страху.

У змроку земляной хаты пасля яркага восеньскага дня свяціліся хіба кінжалы дружыннікаў. Пахла дымам, цвіллю і палынам. Калі вочы звыкліся, князь убачыў, што дружыннікі стаяць ля кашлатай істоты, шматковая вопратка якой ушчэнт хавала абрысы цела.

Харуговы знайшоў лучыну і запаліў яе. Вельмі старая кабета са зморшчаным тварам праз свае сівыя космы прагна глядзела на князя, глядзела нечакана бліскучымі сінімі вачыма. Яна не звяртала ўвагі ні на харуговага, ні на дружыннікаў, якія стаялі поруч, а ўпарта ўзіралася ў князя.

– Хто ты? – спытаў харуговы.

– Лекарка..., але для цябе варажбітка, – не адрываючы ад князя вачэй прасіпела старая.

– Як тваё імя?

– Кула.

– А хрысціянскае імя маеш?

– Няма цэркваў у нашых балотах.

– Што тут робіш? – працягваў харуговы.

– Цябе чакаю, – адказала князю старая.

Князя пачала забавіць такая дзіўная размова, у якой ён нібы і ўдзельнічаў, але, разам з тым, не казаў ні слова. Як на перамовах у тэўтонаў ці ў палацы са сквапным братам, калі той ужо стаў каралём “Ягелло”.

– Праз дурны язык страціш галаву, нахабная баба. Ты хоць ведаеш, да каго прамаўляеш?! – харуговы павярнуў галаву

да ахоўніка нешта сказаць…

– Вялікі Віт, сын вядункі Біруты! – усе знерухомелі. – Я даўно цябе чакаю. Так даўно, што ўжо састарылася, – са з’едлівай усмешкай прарыпела старая. – Нахіліся, скажу табе нешта.

Харуговы і дружыннікі перазірнуліся.

– Нахіліся, харобры Віце, маю словы да цябе…

Харуговы пераступіў з нагі на нагу і напружана паглядзеў на князя, але той ужо нахіліўся да старой і нейкую хвілю нерухома слухаў.

Раптам звонку пачуліся крыкі, падзенне целаў, тупат і рычанне, а неўзабаве рогат і ўсмешкі. Князь павярнуўся да выйсця.

– Зважай, Князь выходзіць! – крыкнуў харуговы.

Усе выбраліся з хаткі і пабачылі звонку дзіўную карціну: нізкі і каржакаваты дзед з кіем у руках адбіваўся ад дружыннікаў, якія пасміхаліся з яго і здзекліва ляпалі старога плазамі мячоў. Болей за ўсіх гарэзілі падвыпілыя маршалак і гетман. Адзін з дружыннікаў наблізіўся:

– Пане харуговы, гэты стары корч неяк перасягнуў ачапленне і нават збіў з ног колькі ахоўных. Рвецца да хаціны нібы вар’ят, не кідае кій і рычыць бы звяруга.

Праз цемру хаціны пачуўся крык вядзьмаркі:

– Заранік, спыніся, усё наканавана, не злуй іх!

Дзікі дзед павольна і неахвоча апусціў кій, але працягваў рычаць.

– А цябе, Князю, буду чакаць, – пачулася з хаткі, – шмат чакала і яшчэ пачакаю…

– Засекчы ведзьму, кубло яе спаліць! – крыкнуў харуговы.

– Не, – упершыню прамовіў слова князь. Усе, хто памкнуліся да зямлянкі, няўцямна спыніліся. Сядаючы на каня, князь крыкнуў:

– Рушым!

Крэўскі замак нібы свяціўся. Такую колькасць паходняў тут яшчэ ніколі не палілі. У дворыку прагіналіся густа накрытыя сталы. На агнісках смажылі казуляў. Са склепу выкочвалі чарговыя бочкі, падчашы каштаваў стары мёд і на ўвесь замак раз-пораз роў "Годна!" Пір паволі дасягнуў вышэйшага накалу. Вясёлыя спевы чаргаваліся танцамі, ад розных куткоў ляцеў візгат служачак і смех пахолкаў, часам біліся аб падлогу кубкі. Маршалак заехаў між сталамі на кані з мячом у руцэ, але не паспеў дакрычаць нешта пра руйнаванне Мальборка, як зляцеў з сядла роўна на спалоханага паляўнічага сабаку. Нехта бразгаў па гуслях, а ў куце дворыка чуліся ціхія гукі клавесіна, падараванага князёўне Ганне немцамі, гэта было парушэнне этыкету, але ўжо ніхто не звяртаў увагі. Панаваў узнёслы гумор і салодкі хмельны палон.

Але князь быў задуменны. Ні пабрацімы-дружыннікі, ні заморскае віно, ні падарункі паслоў, ні навіна пра хуткі прыезд Ганны, ні радасць колішняга палявання, нішто не здолела адвесці думкі ад словаў варажбіткі. Яе пранізлівы голас працягваў гвалціць слых: "Мусіш дбаць пра тое, што збудаваў, нават пасля сваёй смерці! Хе-хе-хе! Шмаааат зайздросных гнілазубаў пакваціцца на твае скарбы! Хе-хе-хе! Не паклапоцішся – усё згіне! І страты твае пачнуцца толькі пасля смерці тваёй! Хе-хе-хе! Глядзі… яшчэ не позна…"

Князь узняўся, зварухнуліся ахоўнікі. Большая частка п’яных галасоў адразу змоўкла. Азіраючы сваю разгулялую світу князь прамовіў:

– Скачам пад Смаргоні, дзе палявалі ўчора.

Нехта з пасалавелых дружыннікаў голасна ўздыхнуў, пахолкі моўчкі пайшлі да коняў. Кашталян пабег да мечнікаў і брамнай варты…

Група конных вояў аддалялася ад залітага святлом замка ў непраглядную цемру лясной дарогі.

Дрыготкі адбітак лучыны зліваўся з сівым тварам вядзьмаркі. Старая ледзь чутна пасмейвалася. Гэта злавала князя. Магутны ўладар вялізнай дзяржавы, які перамог неадольных псоў-рыцараў, забойца шматлікіх падазроных у здрадзе, ён сядзеў цяпер перад старой кабетай і чамусьці дараваў ёй усе з’едлівыя ўсмешкі.

– Ты прыехаў, – старая павольна варушыла пальцамі густыя лахманы. – У нябёсаў свае расклады. І разумны той, хто ім не пярэчыць, – яна троху памаўчала. – Хай усе сыдуць адсюль.

Князь зірнуў на харуговага, той нязгодна пахістаў галавой.

– Каб адбылося ўсё, што наканавана нам з табой, давядзецца табе, велькі Віце, асмялець. Пераможца тэўтонаў палохаецца нямоглай кабеты?!

– Пане Вітольдзе, кепская ідэя, – для пераканаўчасці харуговы паклаў руку на плячо князя, што было забаронена ў звычайным жыцці.

– Выйсці ўсім, – не паварочваючы галавы загадаў князь.

Старая засмяялася:

– Хе-хе-хе…Ты не ўцяміў… яны мусяць не проста выйсці, але з’ехаць з гэтага лесу. Калі застанецца хоць адзін, я адчую. Загадай скакаць адсюль ажно да світанку.

Князь не спяшаўся аддаваць загад, але ўрэшце кіўнуў галавой. Нерашуча затупалі прэч ногі, забразгалі шпоры, зазвінелі наручы, глуха задзынкалі кінжалы аб похвы,

загрукалі і аддаліліся ў цішыню капыты. Праз колькі часу стала зусім ціха, патрэсквала хіба лучына ды галлё ў печы. Старая ажывілася:

– Сядай бліжэй да агню, на гэтую калодку, – яна паказала на месца ля пячуркі і працягнула драўляную конаўку з пахучай вадкасцю. – Пі ўзвар…

– Перадай мне, вялікі Віце, вось той маленечкі збаночак злева ад цябе… А зараз аддзяры белы грыбок з замшэлай дошкі праваруч… Выцягні карэньчык з-пад ног… Адарві каліва зёлак над галавой… Двойчы абнясі ўсё, што сабраў, вакол сябе… Плюнь і кідай у вогнішча!

Па пакоі паплыў густы задушлівы дым. Голас старой пачаў аддаляцца і пры тым гучаць глыбей у вушах князя, нібыта патрапіў у яго самога:

– Заплюшчы вочы, спыні думкі, дыхай напоўніцу і зкінь цяжар!

Адыходзілі знешнія гукі, языкі полымя пад катлом станавіліся ўсё болей пунцовымі і павольнымі. Рысы навакольных рэчаў зліліся ў адзінае тло. Уладным голасам самога князя ў галаве прагучаў загад вядзьмаркі:

– Вазьмі вугельчык.

Хісткімі здурманенымі рухамі князь пацягнуўся да агню, крыху затрымаўся ў нерашучасці, але потым засунуў рукі ў полымя. Болю не было, пальцы не паддаваліся агню. Ён абраў самую вялікую галавешку і ўзяў у далоні. Калі выцягнуў, галавешка засвяцілася яркімі колерамі і пырскнула ў розныя бакі сінімі і жоўтымі іскрынкамі, якія нібы ўвабралі ў сябе зіхценне тысячаў валошак і рамонкаў.

– Кінь вугельчык у кацёл і глядзі, – голас старой зрабіўся зусім падобным да ягонага. Ён гучаў упэўнена і рашуча, нібы сам князь загадваў сабе.

Трымаючы вогненную кветку, рукі павольна ўзняліся над кіпячай вадой. У выпарэннях кветка памножыла свае промні, яны паплылі па століі асвяцілі ўсю хаціну. Усё навокал насыцілася валошкава-бэзавым колерам.

Князь кінуў кветку ў кацёл і ўся вадкасць зрабілася празрыста-блакітнай. Пастыпова са дна ўзняліся віхуры каламутных хмарак, яны ўздымаліся да паверхні, перакрыжоўваліся з іншымі і складаліся ў візерункі. Завязваліся карціны, паўставалі постаці… Між мноства віхураў акрэсліліся дрэвы, рэчы, людзі… Яны рабіліся выразней і выразней… Татары, жаўнеры, алебарды, рушніцы, спаленыя весі… Каламуць паўзла далей… Грамата на польскай мове, шабельная бойка… Віхуры згушчаліся… Ключы ад горада, ваяр са святым Георгіем… Трохкутныя капелюшы, парахавы кнот пад храмам… Шыбеніцы, сцягі з арлом… Вогнішча з кніг… Вялізныя гарматы… Жабракі з чырвонымі стужкамі, разбіты звон ля царквы… Зіхоткае воблака, бычок з трыма галовамі… Зкінуты герб, рваныя грунвальскія вымпелы… Жалезны чалавек, старыя кнігі… Гідкая істота... Вялізнае мора... Попел з неба... Людзі ў глыбіні чорнага неба... Голы краявід, жалезныя дамы... Перапляценне маланак...

Князь прачнуўся хутка, нібы выплыў з глыбокага віру. Ён ляжаў на грубым ложку, засланым саломай, і быў накрыты касматым смуродным футрам. За дзвярыма паўземляной хаціны спявалі птушкі і свяціла сонца. У целе была слабасць, моцна хацелася піць.

Ён не адразу заўважыў ля суседняй сцяны старую. Яна злівалася з гнілой драўнінай, выразныя былі толькі вочы, якія пільна ўглядаліся ў князя. У хатку ўціснуўся каржакаваты дзед з кубкам і прасунуў яго князю.

– Казінае малако, яно верне прытомнасць, – зварушылася старая.

Князь адпіў і паспрабаваў узняцца. Па вачах пабеглі промні. Ён зноў прысеў на ложак. Вядзьмарка ўсміхнулася:

– Хе-хе. Не спяшайся. Твае ваякі прыскакалі на золку. Не вытрымалі. Уварваліся, пабачылі цябе спячага. Чакаюць звонку, – яна трохі памаўчала. – Усё памятаеш?

Князь паварушыў зсушаным языком і, крыху пачакаўшы, спытаў:

– Што я бачыў?

– Хе-хе-хе! Злыя нягоды... і спадкаемцаў!

– Усё так і будзе? Такія руйноты? Нават тэўтоны гэтага не здолелі! Ты разумееш, што кажаш?

– Хе-хе-хе! А я нічога і не кажу. Ты сам заварыў зёлы, сам злучыў агмень з вадой і сам усё пабачыў. А глядзець у будучыню – вяліііізны цяжар. Многія плямёны ідуць такім шляхам. І твой народ таксама будзе шматразова знікаць. Увесь, дашчэнту, доўга канаць і з пакутамі нараджацца. Шматразова. А бальшыня ўзненавідзіць сваіх жа дзедаў і ўвесь свой род.

– Што ты вярзеш?! Брыдкая ведзьма! Дзед, кліч маіх людзей!

– Ёсць сродак выратаваць усё! Але не табе. Тваім людзям. Прывязі мне дзетак сваіх лепшых ваяў!

– Вар’ятка! Змоўкні лепей, калі жыццё цэніш!

– Маё жыццё не каштуе нічога, яно штосьці каштавала толькі да размовы з табой, потым яно не патрэбна нікому. Тым болей мне.

Забеглі маршалак, харуговы і дружыннікі. Дапамаглі князю ўзняцца.

Старая ўзняла вочы да столі:

– “І ўзносяць з таго врэмені мечы друг на друга ўнукі

Валадзімеравы і ўнукі Ўсяслаўі.”

Маршалак пасміхнуўся:

– Не чуў раней, каб ведзьмы манастырскія летапісы цытавалі!

– А гэта не манастырскія, і не летапісы, ды і не створаны яны яшчэ.

– Не створаны?! Не разумею, як гэта мажліва?!

– Ды, і не зразумець вам, заціснутым у адной веры, з адным Богам і ў адным адчуванні… Гэта калісьці магутныя паўночныя ведзьмары пасылалі лепшую кроў, самыя моцныя сэрцы і слупы сваёй трываласці далёка наперад. Але іхнія таямніцы з іхнімі капішчамі знішчаны хрысціянамі, таму невядома куды трапілі гэтыя воі.

Князь паглядзеў на сваіх служак:

– Яна кажа, што нам патрэбна накіроўваць драбаў не на мяжу з немцамі, а да наступных князёў і на наступныя войны. Каб яны ваявалі там за нас і за нашых ўнукаў… Ніколі такога трызнення і такой лухты не чуў. А скажы, шалёная баба, да каго і куды ісці ім? Да ўнукаў, праўнукаў, прапраўнукаў?

– Неее. Я так не здолею, у старыя часы можа ўмелі, а я цяпер не. Хіба… далёка, куды патрапяць. Сама многага не разумею.

– А гнева боскага не баішся, старая вар’ятка?

– Хе-хе-хе. Калі ўрэшце новы Бог адолее нашых дзедавых багоў – гарэць мне ў вашым пекле за такія дзеі. Чакаю цябе княжа.

Харуговы запытальна хіснуў галавой на старую. Князь момант разважыў:

– Хай жыве, едзем!

Сон зварушыў душу і прыгнечыў настрой. Мроі, якія несла цемра, непакоілі. Духі ночы зноўку малявалі лясную хаціну, зноў прамаўлялі словамі вядзьмаркі пра будучыню.

Дзень мінаў у благім настроі, непакоіла чарговае начное відовішча. Думкі пра яго віравалі ад самага ранку. А таксама ў Канцылярыі і нават у параднай зале, калі маршалак зачытваў расклад паслоў. І падчас першага прыёму, і падчас цырымоніі, і ў часе абеду. Так цягнулася ўжо месяц. Месяц знямогаў уначы і развагаў удзень. Колазварот вар'яцкіх сноў і нервовых зрухаў, якія шкодзілі справам, не адпускалі і не дазвалялі думаць ні пра што іншае. Як гэта спыніць, як рассекчы гэты вузел? Хіба, адным чынам – зноўку кіравацы да яе...

– Прыкладзі да ілба вось гэты чорны камень, – голас вядзьмаркі зноўку рабіўся падобным да ягонага. – Проста павер у мае словы, бо спраўдзіць іх не здолее ніхто, – усё навакольнае аддалілася, а старая быццам праплыла праз паветра і наблізілася да князя. – А цяпер слухай. Адбяры дзетак у сваіх самых адданых пахолкаў і драбаў, а іх саміх забі. Інакш ніяк, бо бацькі будуць помсціць за дзяцей. Прывязі мне немаўлятаў, а потым знішчы ўсіх, хто будзе выконваць гэты загад. Не павінна застацца ніводнага сведкі. І сам потым ніколі сюды не наведвайся... Нічога і нікога тут ужо не знойдзеш...

Яны трапяць так далёка, што ніводнай думкай не сягнуць тых даляў. Адзінае вядома, што, дзе б ні апынуліся, будуць шчыра і невытлумачальна адданыя твайму гонару і тваім марам... Нясчасныя, бо злучылі ў сабе розныя сусветы, і шчаслівыя, бо адчуюць свой неверагодна наканаваны лёс і выразна ўсвядомяць сваё пакліканне. Нават не разумеючы крыніцаў сваіх думак і нязвыклага позірку на свет... Твае людзі сярод наступных... Тваё зерне на тваёй зямлі ў

вечным звароце сумневаў і сталення... Здольныя заяўляць сваю прысутнасць, жывіць сілы нашчадкаў і бараніць іх культуру ва ўсіх панаваннях... Вечна шукаючы свой радавод...

Але між усімі акалічнасцямі ёсць адна, якую ніхто не здольны парушыць – кожная спроба прасякнуць думкай у таямніцу сваёй прадвызначанасці адразу напаткае імгненнае супрацьстаянне Плыні. Яна заўжды помсціць, і за неахайную цікавасць, і за памкненне да адваротнага руху, помсціць жорстка, б'е няўмольна, а пры настойлівых памкненнях да яе – катуе да смерці.

А яшчэ хай асцерагаюцца людзей са шнарамі на бровах і хінуцца да тых, хто мае радзімку па цэнтру левай ступні...

– Ведаю твае думкі, Княжа.

– ...?!

– Не ў розуме справа, а ў здольнасці да адчувальнага служэння. Вось сапраўднае пакліканне духоўнай істоты ў Сусвеце.

– Ты прамаўляеш нібы вучоны муж, нібы храніст з кляштара!

– Вось, менавіта "муж"! Не знайшлося месца кабеце між кніг і ведаў... Не ўжыла здольнасцяў, падораных багамі, не тады нарадзілася. Абражалі, гналі і нават калечылі мяне... Толькі ў гэтым гушчары, толькі на лекаванне і варажбіцтва прыдалася я людзям. А яшчэ на выкананне лёсу...

* * *

Яны будуць выдатнымі асобамі з асаблівымі якасцямі і талентамі. Вёрткія і кемлівыя авантурысты, дзівакі і

валацугі, творцы і прыдумляльнікі, заўзятары і фанатыкі. Яны будуць захапляць іншых сваімі ідэямі і дзяліцца перакананнямі. Яны стануць арнаментам гісторыі, формамі, у якія будзе ўлівацца жыццё. У адрозненне ад тых вар'ятаў, што ўпрыгожваюць свае думкі чужымі карункамі і вечна шукаюць іншародныя формы, куды прагнуць уліць сваё існаванне.

Твае вечныя маладыя дзеці ў стомленых і старэючых царствах, яны будуць жыць у палоне мрояў, захаплення і гарэзлівага смеху! І сваю мудрую дзіцячасць яны выставяць супраць прэснага розуму парахнеючай чалавечай грамады. Іх паэзія жыцця – выклік і спаборніцтва, выпрабаванне загадкавасцю і самаперакананасць, вядзьмарства і вяшчунства. Яснавідныя містыкі! Іх паспрабуюць абцясаць і прыстасаваць да пануючага ладу, накіраваць думкі ў прынятае рэчышча, паспрабуюць выправіць іхняе адхіленне, вярнуць у нармальнасць, паспрабуюць заціснуць у дзейсныя каноны і межы мыслення. І некаторыя з іх прыстасуюцца, паменшаць сваю моц, здадуцца на карысць усталяванага, схаваюць здольнасці і, урэшце, пакрочаць па шляху, які праклалі менш адораныя. А вось устойлівыя, нягнуткія, тыя, каму будзе непатрэбна ўхваленне, абсалютна пазбавяцца статку і створаць свой Сусвет. Дакладней, нанова ўзгадуюць твой...

Ім нічым ужо не дапамагчы. Асабліва ў Міжчассі, якое нават пасля яго пераадолення, трывала трапляе ў душы, крочыць поруч і заўсёды вабіць у свае непераадольныя розумам чорныя віры. А яшчэ па Міжчассі бадзяюцца драпежныя істоты, якія імкнуцца схаваць сваё існаванне. Яны перакрочылі праз час аднойчы, і ўжо не здольны спыніцца. Яны нахабна абыходзяць законы таямнічага часавага механізму, які супрацьдзейнічае зменам, але на сутыкненні эпохавых плыняў знаходзяць празрыстыя хвалі і разгойдваюць пульсуючыя паслядоўнасці падзей.

Гэтыя істоты – нахабныя і самаўпэўненыя злодзеі. Страціўшы сваю часавую Радзіму, яны залятаюць у іншыя прасторы і там дзеля забавы і злога здзеку расцярушваюць неўласцівыя перакананні, мастацкія вобразы, памкненні, навуковыя ідэі і нават веравызнанні. А таксама гатуюць жудасны псіхоз – змешваюць аскепкі мінулага з кавалкамі будучыні.

Іхнія ахвяры не здольныя адэкватна прыжыцца ў сваім часе, бо адначасова захопленыя ідэямі мінулага і апантаныя новымі, не свайго часу ведамі, якія яшчэ ніхто не здольны ўспрымаць. Гэтыя небаракі абсалютна губляюць сувязь з адэкватнай рэчаіснасцю. Найцяжэй ім даюцца кантакты з "цвёрдымі" сучаснікамі, якія абмежаваны ў часавым полі думак, з тымі сучаснікамі, хто кантралюе сваю эпоху і дасягае ў ёй поспеху, альбо тымі, хто з-за слабасці творчай волі жыве выключна сапраўдным і спакойна пражывае свой лёс. Ні першыя, ні другія не цікавяць галодных часавых валацугаў з-за няздольнасці атрымаць ад іх колькі-небудзь вартую колькасць эмацыйных надрываў.

Ёсць яшчэ адна вычварэнская гульня, якой забаўляюцца часавыя валацугі – гвалцяць душы тых, хто не задаволены хуткасцю наваколля. Дакладней, не задаволены тым, што час ідзе хутчэй за тоеснасць іх розуму. Абмежаваныя псіхічныя і фізічныя магчымасці ставяць "павольных" на мяжу апатыі, што правакуе магутныя выбухі пачуццяў.

Здараецца, дзеля вышэйшай забавы гандляры часам перакідваюць праз эпохавыя плыні асаблівы тавар – людзей з неверагодна вялікай прывязанасцю да часу свайго псіхічнага нараджэння, людзей з поўнай неадпаведнасцю любой іншай эпосе. У любым чужым грамадстве гэтыя згубленыя самотнікі мэтанакіравана займаюцца згушчэннем часу і пагоняй за збеглымі імгненнямі. Працаголікі, апантаныя мастакі, псіхічныя дысідэнты, сацыяфобы, няшчасныя закаханыя, рэвалюцыянеры – вось вынік гэтай ганебнай спекуляцыі. Звычайнае жыццё не

знаходзіць у іх водгукаў, яны прагнуць душэўна хворых сноў, начных жахаў, жудасных прадчуванняў, якія зыходзяць з самых цёмных куткоў іх душаў. Атрымаўшы спрэсаваную часавую субстанцыю яны дабраахвотна надрываюць сябе і гараць ярка і прыгожа, але хутка. Часта сваё гарэнне яны ўзмацняюць алкаголем… ці расквечваюць рэлігіяй, альбо тым і другім разам.

Зрэдку перажыванне сваёй часавай неадпаведнасці аказваецца несумяшчальным са свядомасцю ці агулам са здаровым розумам. Пачварнае бязладдзе, ламаныя злыя летуценні – спрыяльнае ворыва для гадавання вычварных мрояў.

Іх вяшчунскае памкненне да закрытага, схаванага, таемнага адкрывае дарогу ў наш свет таму вялізнаму, ад якога людзі хаваюцца за розумам і ўпарадкаваным мысленнем. Тое вялізарнае – сапраўдны гаспадар іх душ. Праз адчыненыя дзверы нялюдскага свету імі кіруе неспасцігальнае, уладарыць з неабходнасцю і непазбежнасцю, каб у сваім няспынным магутным памкненні вырываць людзей са сферы чалавечага і прымушаць служыць сваім мэтам.

– Не паеду болей у той лес… Што гэтая страшная ведзьма робіць з нясчаснымі дзецьмі? Возім-возім, а іх там няма… Хіба звярам аддае? Ці сама з’ядае?… Кожны раз дрыжыкі па спіне, як яна радасна аглядае новыя ахвяры. Смяецца і блішчыць сваімі пякельнымі вачыма… Я вар’яцею! Лепей выгнанніцтва і страта службы, лепей здрада і жабрацтва, чым глядзець на немаўлятаў і на гэтае драпежнае валхаванне. Не паеду!

– Вядома, не паедзеш, усё скончана. Ты звычайны мечнік, просты выканаўца ў неспасцігальнай гульні, часціна невядомага табе плану. Князь табе дзякуе за службу, ты выканаў усё неабходнае. Нажаль, ніколі не даведаешся,

якую справу ажыццявіў і да чаго спрычыніўся. Проста павер. Вечна жывы ў наступствах і мёртвы цяпер. Ты – першы ваяр новага Ордэну! І дзеля яго жыцця мусіш загінуць. Не крычы, я зраблю ўсё хутка. Бывай, браце.

## ОРДЭН

●

– А хто яна такая і чаму мае права прамаўляць да веча?

– Удава пасадніка Барэцкага, яе сын Дзмітрый кіруе нашым апалчэннем.

– Адкуль яна? Мо перасяленка? Паслухайце, што кажа: звярнуцца да Літвы, накіраваць паслоў да караля Казіміра, прасіць прыслаць архіепіскапа, паклікаць з Літвы на княжэнне Міхаіла Алелькавіча, далучыцца да Княства Літоўскага, славене – браты крывічоў...

– Мо і сапраўды ліцьвінка?

●

– Дзіцё маё, ты робіш памылку, татары на парозе, палова княства ўжо разрабаваная, а князь Міхаіл мае досыць вайсковае моцы, каб абараніць нас. Ды і каханне між вамі раней было, сапраўднае, няўрымслівае і шалёнае, і паразуменне было. Але потым... што здарылася?

Айцец паправіў бараду:

– Я ведаю цябе з дзяцінства, ты спавядалася мне шматкроць, а зараз закрылася і маўчыш. Адумайся! Ужо не

толькі за сябе адказваеш, а за град, за княства, за людцаў, за сына. Урэшце, за святыні, якія нехрысці драпежныя абкрадуць і спаляць!

Яна сядзела моўчкі. Як адолець цяжар палітыкі, цяжар, неўласцівы жанчыне? І разумна было б прыняць сватаўство, аднак… нельга прымірыцца з тым, пра што пазамінулай начы даклалі віжы – Міхаіл просіцца на службу да князя Васілія, мае намер здрадзіць людзям, Княству, ёй! А розум князёўны мусіць быць халодны, скіраваны на выгоды сваёй зямлі, у любым становішчы. І ўсё ж сэрца не даруе здрады, і асабліва не даруе каханаму. Ад татараў Міхаіл абароніць, але пацягне за сабой у ганьбу выгнанніцтва… І каханне да яго не мінула, ды і ніколі не міне, як любое моцнае пачуццё ў жыцці жанчыны. А вось павага ўжо знікла, расцярушылася. Нельга без павагі ісці да вянца і стаяць перад вачыма боскімі. З іншага боку, дружыне патрэбна магутная асоба, сімвал, мужчына, ваяр, правадыр. А гораду і сыну абаронца.

Спачатку ваявода, а зараз яшчэ і айцец патрабуюць згоду, а сэрца ўпарціцца. І няма сілаў ісці супраць яго. Выйсце адное – самой стаць моцнай і рыхтавацца да вайны… Нервова. Татары, княства, горад, Міхаіл, Юрый, татары, здрада, сын, горад… Чаму на яе столькі ўсяго? Колькі намаганняў спатрэбіцца, каб вытрымаць гэта, і дзе шукаць духоўнае падтрымкі? Матчына любоў, любой да роднага – хіба што…

Затрашчалі свечкі. Пэўна, з воску шалёных пчолаў. Яна рашуча ўзнялася і выйшла да залы. Месцічы і радцы схамянуліся і змоўклі.

– Але загад! Паслаць па ваяводу, прызначыць раду, дружыне дбаць аб рыштунак, збройнікам таўчы порах, занатаваць усе прыпасы, біць у апалчэнскі звон!

●

– Эй, малец, хадзі сюды! Дапамажы воз вытурхаць! Ды, азірніся ты, кніжкі па бруднай каляіне расцярушыў!

– Аааа, Бог з ім, дзівак нейкі. Самі выпіхаем. Другі тыдзень з намі ідзе, а зразумець яго не магу – нешта вуркоча сабе пад нос, ежы спажывае мала, спіць па корчмах ля каміну. І кожны вечар сушыць глузды сваім чытаннем. Адукаваны, але апрануты, бачыце як…

– Ягоны бацька – паважны купец з Полацкай гільдзіі, ён быў супраць падарожжа гэтага небаракі, але не здолеў утрымаць яго дома.

– Заўважце, які ўпарты! У такі шлях пакіраваў амаль без грошай. Мае мэту!

– Мусіць, такую ж недарэчную, як і сам. Дый, годзе, людцы, штурхаем! Хай раз, зноўку раз, трэці раз, пера-раз…

…Як цяпер кніжкі ад гэтае халоднае твані вычысціць? І прасушыць. Хіба ўвечары, а цяпер давядзецца вільготныя пад пахай несці, стане зусім непамысна. Хаця змерзласць – намнога меншы боль за згрызоты сумлення. Да скону давядзецца ў Бога выбачацца за тое, што скраў Пісанне з кляштару… Але ж на карысць паспалітую, дзеля пачэснае справы! А перад бацькам сорамна за куфар цэховы… Грошы пазней вярну, а злачынства Бог даруе, бо ягонае Слова, Святое Слова панясу па свеце.

Узгадалася вясновая Палата ля Сафіі, зелянюткія стромы Дзвіны! Як жа цяжка было збягаць з дому і рушыць у такую авантурную выправу. Берасце мінулі, хутка мяжа з Каронай. Чым далей ад родных мясцінаў, тым болей цягне вярнуцца. Але ёсць тры рэчы, якія даюць імпэт рушыць далей – высокая адукацыя, духоўныя кнігадрукі і жудасная цікавасць пазнаёміцца з астраномам Мікалаем!

Грошы, скрадзеныя ў бацькавым цэху, хутка скончацца. Каб не згаладаць зусім, давядзецца ў Польшчы падрабляць навучаннем. А да Кракава яшчэ міль 300.

Галодная стома і падарожныя пакуты зноў вярталі да думак пра дом. Як бацька, як браты, як манастыр? Ігумен столькі дазваляў чытаць між пісарскай працай! І сыты быў, і пры бібліятэцы, і ў цяпле… Але! Калі ж гэтая вар'яцкая думка завалодала свядомасцю – чаму немцы могуць друкаваць кнігі, а мы, такія разумныя і таленавітыя не можам? І зямля нашая не горшая, і людзі кемлівыя. Духоўнасць Святога Пісання… Мясціны, дзе нарадзіўся і ўзгадаваны быў… І ласку да роднага горада маеш… Бацькі і ігумен здзіўляліся, адкуль такія меркаванні ў гэтага мальца. А я і сам не ведаю адкуль. Дарэчы, адкуль?...

Думкі віравалі гучней за ледзяны вецер, іх было ўжо не стрымаць.

…

– Маргарыта, жонка мая каханая, я ў адчаі ад безвыходнасці. Гэтая пошасць апанавала ўжо цэлую Вільню. Я перабраў усе лекі і зрабіў ўсе магчымыя захады, ніякія сродкі не дапамагаюць, ні парашкі, ні зёлы, ні ртуць, ні кровапусканне, ні чыстка, ні прыпальванне, ні піяўкі. Пакуль ты была ў непрытомнасці я нават прыводзіў да цябе шаптуху. Я, доктар вызваленых навукаў з медычнымі ведамі, і ганьба мне, ганьба ўсёй медыцыне – я не ведаю, як цябе выратаваць. Перад вачыма Боскімі клянуся, калі не дам рады цябе ўзняць, не буду жыць на Радзіме і нават не выдрукую болей ніводнай кнігі...

●

– Што пішам над труною? Царкоўныя ці вайсковыя заслугі?

– Гэта фундатар Лаўры, пішы ўсё! Спачатку тытулы ваяводскія і гетманскія, потым пра паходжанне і сям'ю, пішы: з роду турава-пінскіх князёў, быў жанаты спачатку на князёўне Таццяне Гальшанскай, а потым на князёўне Аляксандры Слуцкай. Дабрачыннасць дзеяў: будаваў

праваслаўныя цэрквы ў Вільні і на Валыні, будаваў манастыры і замкі, заснаваў для жабракоў шпіталі, для дзетак школы. І, урэшце, вайсковыя заслугі: перамог у 63 бітвах, за талент і смеласць у 37-гадовым веку атрымаў чын Гетмана найвышэйшага, на ўласныя грошы шыхаваў войскі і ставіў харугвы вершнікаў, за ўзорнае гетманства ў ягоны гонар ладзілі Трыумф у Кракаве. Памёр у Тураве, паводле ягонага жадання пахаваны пад Успенскім саборам у Лаўры, дзе ўжо амаль стагоддзе спачывае ягоны святы прадзед Фёдар.

– А яшчэ кажуць, што загадваў пахоўваць з гонарам адзінаверных загінулых ворагаў. Шанаваў іх. Пра гэтае пісаць?

– Не, не варта. Хаця, сапраўды, дзіўны такі звычай меў. Біў іх няшчадна на полі, але потым цэлае рушэнне трымаў на месцы бітвы, не адпускаў войска дадому і прымушаў пахоўваць забітых уварванцаў з усімі належнымі праваслаўнымі абрадамі.

●

– Слухайце, а што пра яе вядома? Ноч доўгая, бацькі з’ехалі, варта пільнуе брамы, выхавацелька болей не завітае, таму можам шаптацца ўсю ноч! Дзяўчынкі, распавядайце ўсё – навіны, плёткі, жахі!

– Яна дачка князя Юрыя, якога яшчэ “літоўскі Геркулес” звалі, таго, што сябраваў з гетманам Астрожскім. Дык вось, яна незвычайнай прыгажосці і выхавання! А які лёс мела! У 17 гадоў яе выдалі замуж за ваяводу троцкага Гаштольда. Але за нейкія цяжкія справы яе род якаясь моцная чараўніца сурочыла і пачалі ўсе навокал паміраць – на працягу пяці гадоў адыйшлі яе свёкар, свякроў, бацька і нават муж памёр. У 42-м годзе маці забрала яе з пустога дому ў Троках і завезла ў Вільню да брата Мікалая, якога звалі Руды. А там знаходзілася рэзідэнцыя маладога і

прыгожага каралевіча па мянушцы Аўгуст. На нейкім там прыёме пазнаёмілася яна з каралевічам, і, кажуць, наслала на яго такія моцныя варожбы, што той адразу страціў увесь розум і пачаў валачыцца за ёю, а праз нейкі час сталі яны ўпотай сустракацца – літаральна ў тым жа каралеўскім палацы. А быў той каралевіч ужо жанаты, жонка ягоная, Альжбета, мела, дарэчы, вельмі знакамітую кроў – каралеўскага роду Габсбургаў. Каралевіч жа да таго быў зачараваны сваёй каханкай, што нахабна зрабіў яе фрэйлінай сваёй жонкі. Але дзяцей у іх з каралеўнай не было, ды і як ім быць, калі каралевіч з фрэйлінай мілуецца! У 45-м годзе раптоўна ў маладым ўзросце памірае каралеўна Альжбета, і гэтыя закаханыя пачынаюць сустракацца ўжо адкрыта і безсаромна! І пра тое ведае ўвесь каралеўскі палац!

– Кажуць, каралеўскія дворныя пачалі інтрыгі супраць гэтага раману. Палякі не маглі даравацьь, што каралевіча заваражыла ліцьвінка, што прыляпіла яго сваім чараваннем да Літвы і не адпускае да спраў Кароны польскай! Супраць былі таксама яе браты і мама каралевіча Аўгуста. Пайшлі скандалы і звады пра абразу гонару і патрабаванні спыніць іхнае мілаванне. І нават узялі слова з каралевіча, што ён пакіне яе ў спакоі і вернецца да кракаўскага двару. Але, не на тых напалі! Удумалі закаханыя збегчы і таемна павянчацца. А праз год Аўгуст прадставіў яе літоўскаму Сойму ў якасці сваёй жонкі! Болей за тое, запатрабаваў прызнаць яе Вялікай княгіняй літоўскай, і Сойм мусіў прызнаць! Вось табе і ціхі-ціхі каралевіч, а за сваю каханую пасварыўся з усім светам!

– Там падзеі развіваліся нібы ком! Тады ж як раз памёр стары кароль, і каралевіча тэрмінова выклікалі ў Кракаў, а ягоная мама пачала шукаць новую жонку для сына – будучага польскага караля. А тут высвятляецца, што Аўгуст ужо жанаты на ліцьвінскай князёўне, што іхны шлюб прызнаў літоўскі Сойм і што жонка каралевіча ўжо мае тытул Вялікай княгіні літоўскай! Каралева-мама распачала

плесці змовы, каб не дапусціць каранацыі нявесткі, і нават дамаглася таго, што Сойм польскі прагаласаваў за скасаванне шлюбу. Але не быў бы то зачараваны Аўгуст! Ён прыгразіў ім поўнай адмовай ад каралеўскага трону і дамогся афіцыйнага прызнання іх шлюбу. Урачыстая каранацыя адбылася ў Кракаве ў 50-м годзе. У знак пратэсту каралева-маці з’ехала з Кракава ў Італію. І тады пачалася зусім цмяная гісторыя. Хто ведае далей?

– Па каранацыі нешта стала маладой каралеўне кепска. І тое зразумела – змовы, сваркі, чужы двор, паклёпы, нянавісць. Выклікалі для яе італьянскага аптэкара, які намяшаў ёй зелле, і піла яна тое зелле колькі месяцаў. А праз ужыванне зёлак рабілася ўсё худнейшая і худнейшая, потым ёй зусім паблагела і, як мінуў год пасля каранацыі, каралеўна памерла. Аўгуст да скону не адыходзіў ад яе ложка. Тады ж пайшлі чуткі, што яе атруціла каралева-маці... Перавезлі яе на Радзіму і пахавалі ў нашым катэдральным касцёле. А потым была нейкая містыка з чарадзействам...

– Я чула, што пасля смерці жонкі Аўгуст зусім звар’яцеў. Прыехаў да яе брата Мікалая ў Нясвіж і прывёз з сабой алхіміка-чарнакніжніка, каб выклікаць дух жонкі ў тым самым месцы, дзе яны калісь кахаліся. Ну, Мікалай па глупству і пагадзіўся...

– А чаму не ў каралеўскім плацы ў Вільні, і не ў Кракаве, а ў Нясвіжы?!

– Не ведаю. Але дакладна ў замку ў Нявіжы. Чараўнік папрасіў завесіць усе люстэркі і падчас сваёй варажбы запатрабаваў, каб Мікалай і асабліва Аўгуст трымаліся на месцы, не варушыліся і, крый Божа, не гутарылі. Дух ён выклікаў, але ж кароль памкнуўся схапіць тую постаць, чым не даў ёй вярнуцца туды, адкуль яе паклікаў чараўнік. Здань ў тое ж імгненне знікла назаўжды. Закаханы зусім страціў рэшткі розуму і пастанавіў, што мусіць памерці ў Нясвіжы, каб яны з каханай урэшце сустрэліся. Але яму

тэрмінова спатрэбілася выехаць у Кракаў, дзе ён раптоўна памірае. Таму ягоны стрывожаны дух ужо навек застаўся ў Кракаве. І цяпер да Другога прышэсця іхнія здані будуць бадзяцца па дзвух розных і далёкіх замках. Яе здань па нясвіжскім, а ягоная здань па кракаўскім...

– Вось гэта каханне!

– Страшная гісторыя...

– Дзяўчаты, скажу вам такую рэч – вакол нас пануе варажба і чары, яны ахутваюць і кіруюць усімі людзьмі, усімі, хто хаця б троху здольны да любых пачуццяў.

– А давайце выклічам прывід нашай сядзібы! Ведаю замову, трэба свечкі...

●

– Князь заклаў першы на Літве рэфармацыйны храм. Абраў для гэтага кавалак зямлі на замку Берасця. Шчыруе ў галоўнай пратэстанцкай грамадзе ў Вільні. Заклаў рэфарматарскі храм у сталіцы – у сваім палацы на Лукішках. Вельмі смелы чалавек. І пра Бога дбае, і пра душу, і пра дзяржаву.

– Болей за тое, ён прапануе стварыць Народны сабор усіх хрысціянаў Вялікага Княства і Кароны і зрабіць яго незалежным ад Ватыкану. Кажуць, набажэнствы ў ягоных цэрквах незвычайныя – там прыбралі ўсе перашкоды паміж душой і Богам. Ці чулі што пра гэта?

– Так, яны спрасцілі набажэнства, адмовіліся ад аздобаў, багатага адзення, а яшчэ ад званоў, свечак, абразоў, і нават ад мошчаў святых. З усіх малітваў пакінулі толькі “Ойча наш”. Святароў замянілі настаўнікамі. Самі тлумачаць і чытаюць Пісанне. Прапагандуюць справядлівасць, свабоду слова і духоўнае разняволенне. Зразумела, што людзі пацягнуліся да іх, прычым самага рознага стану – ад

рыцэрства да месцічаў.

– Да гэтага рэфармавання далучыліся ўжо ўсе магнацкія і княскія роды, а таксама многія шляхецкія. Кажуць да іх пайшлі і паньствовыя дзеячы, і цэхавы люд, і купцы, і царкоўнікі, і філосафы... У Рэфармацыі можна праявіць адначасова і духоўнае сталенне, і клопат пра Айчыну. Вось такое спалучэнне!

●

У канцлера балела галава. Усё навокал было супраць ягоных ідэяў. Жудасная вайна на ўсходзе, хцівыя суседзі на захадзе, вандроўныя рабаўнікі на поўдні, страта саюзнікаў на поўначы. Унутраныя сваркі і нават войны вернікаў. І пазбегнуць невыгоднага саюзу з захадам ужо немагчыма. Але як захаваць краіну? Толькі авантура, юрыдычная авантура! Толькі прыхаваны разважлівы падман выратуе яе. Новае заснаванне, новы падмурак, новы Статут! Толькі трывалыя нормы права захаваюць Княства ад поўнага паглынання новай федэрацыяй.

Як жа мала засталося рашучых і дзейсных паплечнікаў, збеглі, прадаліся. Які сэнс так апантана дбаць пра тое, што многім абыякава? Такая шалёная прыязнасць да таго, што для многіх толькі крок да багацця!

Канцлер абапёрся на стол. Упартасць сілкавалася ад невядомае моцы...

●

Кашталяны Лоску адмоўна пахісталі барадамі. Езуіты абурана зашапталіся, інквізітар зрабіў крок наперад:

– Пане Юры і пане Сямён, мы маем вельмі настойлівы загад арыштаваць нахабнага эретыка і даставіць яго ў Кракаў.

– Мы не аддадзім пана Сымона, нягледзячы на вашыя дакументы і на рашэнне вашага суда. Ён годны сын свайго места, варты пашаны месціч і адукаваны муж. І для нас не мае вагі, што ягоная творчасць не адпавядае нечым уяўленням пра веру і Пана Бога. Тут вольны горад з самакіраваннем па ўзоры Майборскага права, і па нашых традыцыях чалавек вольны выказваць свае думкі без перашкоды, нават калі яны і супярэчаць думцы бальшыні. Да таго ж, пан Сымон пераклаў Евангелле на зразумелую нам мову і зараз Слова Божае і апісанне жыцця Збавіцеля даступна нашым дзеткам – яны самастойна могуць пра гэта чытаць. Хай сабе ён і дапусціў вольнасці ў перакладзе, для нас ён выхавальнік, а не ерэтык. Кіруйце дадому, панове, не знойдзеце тут сабе чарговае ахвяры.

●

“Найкаханейшая жонка мая, ясная пані Сафія. Пішу з нагоды найвялікшай маёй зсумаванасці па цеплыні і пяшчоце Вашай, па доме і па нашых дзетках, Боскай ласкай падораных. Маю цудоўную навіну для вас, мае родныя, і для Айчыны нашае дарагое. Праз спрыянне Пана Бога, дзякуючы моцы зброі літоўскай, мужнасці ваяроў, ратнага шацунку оraз непрыяцельскай глупай і нахабнай упартасці, а таксама сціплай думцы маёй гетманскай атрымалі мы непараўнальную перамогу над уварванцамі шведскімі, якія, маючы трохкротную перавагу, былі ўшчэнт пабітыя і адкінутыя ад ваколіцаў места Рыгі.

Тую перамогу войска літоўскае будзе святкаваць у ганаровых формах пасля вартага ўладкавання жалобных цырымоній па загінулых братах нашых.

Вы, мая годная пані Сафія, у ліставанні заўсёды пытаецеся аб стане майго здароўя ў батальных выправах, на конт чаго паведамляю, што трымаю цудоўную форму і бадзёры дух. Маю рэгулярную ежу, ля гарматаў пад час залпаў доўга не

цікую, цэлымі днямі на кані не гойсаю. А каб не выклікаць у Вашай абажанай мною галоўцы падазрэнні ў прыхаванасці сапраўдных акалічнасцяў, сведчу, што прыдбаў дробныя хворыя адчуванні ў патыліцы, прычыны чаго адношу да нервовых станаў у справах палітычных. Сувязь названых непрыемнасцяў і клопатаў дзяржаўных пацвярджаецца іх літаральным часавым супадзеннем.

Спадзяюся на Вашыя лісты, якія ў варунках паязных вельмі вайскоўцу ў побыце спрыяюць. Прашу ў ліставанні надаваць вычарпальную ўвагу дзеткам нашым. Як справы Гераніка ў навуках, фехтаванні шабляй і сталенні цялесным? Якое нашая кветачка Ганначка мае здароўе, імпэт да весялосці, поспех у мовах іншаземных і практыках музычных? Ці адпусціла хвароба маці Вашую? Ці дае рады пан Ян з эканоміяй і маёнкамі?

Чакаю на адказы, добрыя навіны і на цёплыя словы,

Кірхгольм, 1605 г., 27 верасня.”

●

– Карчмар, яшчэ збан мёду! Слухайце далей. Нам патрэбны неспакойныя, шалёныя ваяры. Набіраем жаўнераў любога ўраджэння і любой фаміліі. Калі ты харобны і дужы селянін, можаш суткамі гойсаць у сядле, гатовы ехаць на ўскрай свету і там секчы ворагаў – табе да нас! Калі ж ты шляхцюк, але хочаш ураўнаважнай службы – табе да рэгулярнага рушэння.

– А які ў вас від войскаў?

– Лёгкія вершнікі. Маем шаблі, лукі і дзіды, часам троху вогняпалу. Робім хуткія наскокі ажна на сотні міляў.

– А дзе ўжо паваявалі?

– Шмат дзе. І ў авантуры Дзмітрыя Самазванца, і ратавалі

Смаленск, хадзілі на Паволжжа. Сам гетман Хадкевіч даваў нам заданні, калі болей ніхто тое выкараць не мог. Ладзілі паходы далёка на поўнач, нават да берагоў сівога Белага мора і нават у сібірскія калоніі Масковіі – да вусця ракі Об. А аднойчы ўвязаліся ў пошукі славутай “Залатой бабы” – паганскага стода, якому служаць плямёны Поўначы. Але мала хто адтуль вярнуўся.

– Што плацяць за такую службу?

– Вооось! Тут і спраўдзім, хто з вас пасуе да нашага жыцця! Мы жывем на конях, сілкуемся і зарабляем з таго, што здабылі. Ты жорсткі да палонных вайскоўцаў – дзеля Бога, маеш мілосць да катавання – на здароўе, ты рабуеш чужых асельнікаў – твая справа, прагнеш багацця – выдатна! Галоўнае ўмець і хацець нішчыць ворагаў Айчыны. Мы б’емся за нашую зямлю, хоць з Д’яблам, хоць у пекле, і пры тым апантана і прагна любім золата і не можам жыць без прыгодаў!

– А ці наймаліся куды акрамя войска літоўскага?

– Так. Зараз на ўсходзе пацішала, мы разцягнуліся па дамох, добра папілі, смачна пагулялі і.... засумавалі! Перамаўляемся пра найміцтва да германскага імператара, хутка выходзім ваяваць на Чэхію, Вугоршчыну, Італію, а там і Францыя трымайся!

– А як завуць вашыя атрады?

– Нашыя атрады маюць назву ад прозьвішча камандзіра. Ён “адарві-капыта” авантурны шляхцюк з-пад Вільні. Пад ім гарыць зямля, конь вар’яцее, а паненкі ляцяць да раю! Ад яго і назва – лісаўчыкі.

●

– Палкоўнік, сядайце ля гэтае фурманкі. Ахова, развяжыце яму рукі, прынясіце вады, паклічце лекара... Пане

Палкоўніку, нягледзячы на тое, што Вы літоўскі шляхціч, які здрадзіў свайму паходжанню, вас вызваляць. Але папрашу, Васпане, асабіста перадаць гетману ў Сеч мае прапановы. Тут, пад Лоевам, адбылася апошняя бітва на тэрэнах карэннага Княства Літоўскага, і ў хуткім часе войска, мне падначаленае, пойдзе на Украіну, якая, паводле паскудных захадаў суседскіх, апошняе стагоддзе належыць Кароне. Там маю цвёрды намер навесці законны парадак. Я ўсёй душою прагну незалежнасці Літвы ад Польшчы, у чым назіраю супадзенне з некаторымі намерамі гетмана Багдана. Калі мы знойдзем паразуменне і агульныя інтарэсы, мне не давядзецца болей прасіць шведскае дапамогі ў ратаванні Літоўскага княства ад польскага аншлюзу.

– Пане Гетмане, Ваш патрыятызм і Вашыя ўчынкі вартыя шчырай павагі. Такі адукаваны і геройскі чалавек можа стаць сапраўдным гаспадаром гэтае краіны. Тым болей з роду, які даўно называюць каралямі Літвы. Вашыя словы, кінутыя ў бок польскіх сенатараў у Вільні, цытуюць на Сечы. “Выкідаць праз вокны!” – моцна сказана. Але вайна на Украіне даўно ўжо стала не столькі палітычнай, колькі паспалітай. Пошук справядлівасці для тых, каго адрынулі ўсе панствовыя ўстановы і для тых, каго заплямілі кляймом злачынцы. Вось хто сабраўся там з усіх навакольных земляў. А хаўрус са Швецыяй – памылка... Пане Янушу, з моцнасцю Вашага духу шведская дапамога не патрэбная! Я не перадам Вашыя словы гетману Багдану, бо ўжо ніколі не вярнуся да яго. Дзе паразу атрымаў, дзе імя сваё зганьбіў і дзе палеглі назаўсёды мае пабрацімы, тут і мне ляжаць...

●

У келлю прашмыгнула высокая постаць у чорнай расе з бачонкам пад пахай і праз густую бараду палілася чысцюткая літвінская гаворка:

– Пан Сітніяновіч, тут праз мяжу перадалі напойчык! Ад Братэрства медавараў – вытварны мёд з імбірам і цынамонам! Але... бачу недарэчы, выбачайце, сыходжу.

...

Божа, Ты даў мне выдатнае жыццё! І на карысць Веры, і дзеля мастацтва, і дзеля навукі. Праз музычны тэатр, Акадэмію, пісьменства, праз асвету дзетак царскіх. Адукаваная царская сям'я меней шкоды прынясе той Айчыне, якую я пакінуў. Хай усе лічаць, што я здрадзіў, хай пішуць, што збег за пасадамі і выгодамі. Але ж пакуль вучу радзіну цара, ніводнай вайны, ніводнага рабавання не было ні Полацка, ні Кіева, ні Вільні. Пакуль рыпіць пер'е ў руках царскіх сынкоў, гарматы маўчаць, порах не рвецца і кабеты не галосяць.

І да свайго месца я прыйшоўся, і да свайго часу. Дзякуючы Табе, Пане Божа, меў шацунак нязвыклы. Шмат было, і цяжкага, і лёгкага, але заўжды кіраваўся Воляю Тваёю. Не пярэчыў Табе, а шчыра намагаўся зразумець, дбаў аб чысціні і дзякаваў за пакуты. Гэта мой шлях, мой лёс, які падараваны Табою.

Дзякую, Божа, за ўсё зямное жыццё, за тое, што прызначыў мне хрысціянскую місію, накіраваў думкі і рукі мае, паказаў як несці Волю Тваю і якімі захадамі яе ўвасабляць. Дзякую за спрыянне і за тое, што сілкаваў у жыцці выгнанніка. Дзякую за падтрымку падчас абразаў і паклёпаў. Дзякую за моц маўчання і стрыманасць, калі рабіў сваю працу дзеля тых, хто не бачыў і не цаніў яе. І правая рука мая не ведала тых дабротаў, якія чыніла левая. Тваім Законам у ратаванні душы кіраваўся. У Тваё Імя дзеіў. Сыходжу з мірам пад уладу Тваю ...

●

– Стоп, стоп, стоп! Рэпетуем гэтую дзею нанова. Панове

артысты, вы мусіце зразумець дзве рэчы. Першае: Нясвіж – гэта культурная сталіца сармацкага барока. Другая: мы маем вялізарную высакародную гісторыю, дзе просты люд выканаў вельмі паважную ролю. Менавіта таму камедыі і трагедыі нашага замкавага тэатра насычаны сялянскімі казкамі і легендамі – нароўнай з французскімі і італійскімі сюжэтамі. Па той жа прычыне ў нашых спектаклях гучыць старая мова. На гэтай мове, якую мы зараз называем простай, калісьці пісаліся высакародныя творы, а лепшыя магнацкія роды не грэбавалі замаўляць на ёй панегірыкі да сваіх клейнотаў. Два стагоддзі таму ніхто б не наважыўся назваць прасцецкай дзяржаўную мову Літвы, мову дыпламатыі і высокай паэзіі! І яшчэ, панове артысты, мы не французы і не італійцы, яны, вядома, у многіх творчых дасягненнях ёсць узорам для нас, але мы станем ганебным перайманнем і проста кепскай запазыкай, калі будзем неахайна капіяваць іхнія п’есы. Мусім няўмольна несці ў тэатр сваё, адмысловае, непадобнае. Вось чаму ў нас столькі мясцовага каларыту і сялянскай міфалогіі. Такім чынам, дайце выбух натхнення і ціску крыві! Пан капельмайстар, да аркестру, працягваем!

●

– Акрамя ўсёй маральнай пачвартасці таго, што тут у Варшаве адбываецца, сам Вальны Сойм не мае юрыдычнай падставы, бо паводле чаргі ён павінен праводзіцца ў Гародні, маршалкам яго мусіў быць літвін, а не паляк. Да таго ж, незаконна ладзіць звыклы Сойм пад знакам канфедэрацыі.

Маршалак канфедэрацыі разам з іншымі польскім пасламі ўзняліся і памкнуліся да выйсця з залы. Паслы Літвы ў адчаі схапіліся за шаблі, але нечакана ад уваходу пачуўся пранізлівы крык:

– Не забівайце Айчыны! Забіце мяне, затапчыце нагамі, але

не забівайце Айчыны!

Ля брамы на падлозе ляжаў чалавек, які раскінуў рукі ў форме крыжа. Да яго падбеглі літоўскія шляхцічы:

– Пане Тадэвушу, уздыміся, гэтыя здраднікі не вартыя таго. Прусакі з расійцамі праз пагрозы, шантаж і подкупы дамагліся поўнай перавагі на Сойме...

– А я не гандлюю святынямі!

– У бальшыні проста няма такога адчування Айчыны, як у цябе, шаноўны. Іхнія чорныя душы асвятляе хіба золата. Курвы прадажныя! Ім без розніцы, пад чыёй уладай жыць і каму служыць. Мы з панамі Корсакам і Багушэвічам зрабілі ўсё магчымае, але гэты кухмістр польскі Панінскі прадаў ужо ўсю Рэч Паспалітую. Далей хіба што шаблямі...

– Секчы братоў за змову з ворагам?!

– Здраднікі Радзімы нам не браты.

●

Умацаванні Альянсу ля Саратогі вытрымалі. Знясіленыя ангельцы спынілі атакі і адступілі. Над пазіцыямі генерала Гейтса ўсчаўся лямант, страляніна ўгору, спевы і нават танцы.

Палкоўнік пакінуў сваіх сапёраў за рамонтам рэдута і пайшоў на выклік да генерала. Ля ўваходу ў генеральскі намёт гуртавалася шмат афіцэраў, якія пры набліжэнні палкоўніка пачалі натхнёна вітацца з ім, пляскаць яго па эпалетах, ціснуць рукі і праз аднаго казаць: “Тэдзі, гэта твой дзень!”

Гарэзлівай хадою і з палаючымі вачыма ў намёт уварваўся генерал. Абвёў позіркам усіх прысутных і спыніў вочы на ім:

– Джэнтэльмены, вось такія таленавітыя і мужныя людзі

зробяць нашую краіну вялікай! Прынесці шампанскае!

Ва ўсім наступным віры ўрачыстасці ўсё больш навальваўся сум па далёкай Айчыне, якую ўжо 15 гадоў рвалі на шматкі драпежныя суседзі. Як там каханая Людвіка? Можа час вяртацца?... Тут, за акіянам, барацьба за свабоду, дух вольнасці, поспех, шанаванне і, урэшце, вайсковая кар’ера. Тут з Людвікай яны былі б шчаслівыя. Але цяжка будзе жыць так далёка. Гэтая прага Радзімы… Яна з нейкіх няўцямных глыбіняў...

●

– Пане Міхале, ад імя многіх тут прысутных, а таксама ад імя шматлікіх паплечнікаў, якіх сёння тут няма, скірую да вас пытанне. Чаму ў праекце аднаўлення дзяржавы нашае, які мы склалі на адрас імператара Аляксандра, мы згадваем і прапаноўваем захады па аднаўленню толькі Княства Літоўскага, мінуючы ўвагай вялікую Айчыну нашую Рэч Паспалітую абодвух народаў?! Менавіта за яе мы ваявалі, за яе ўваскрашэнне мы плацілі жыццямі і маёмасцю. Калі ж з’явілася амністыя і многія павярнуліся з выгнання, мы складаем праект адбудовы толькі Літвы, а не ўсёй вялікай Польшчы! Пане Міхале, Ваш аўтарытэт як змагара за непадлегласць варты найвышэйшага шанавання, Вы вальчылі высакародна і аддана, Вашыя дзеі па стварэнні паўстанцкіх атрадаў і Вашыя раны кажуць самі за сябе, але Вы біліся за Польшчу, а аднавіць просіце толькі Княства!

– Шчыра прашу выбачыць, але пытанне пачуцця Айчыны, прыналежнасці да крыві продкаў, павагі да нашага паходжання, як і пытанне душэўнай прывязанасці да сваёй культуры мы з вамі, шаноўная грамада, ужо абмяркоўвалі. Браты нашыя ў Польшчы могуць самастойна стварыць аналагічны праект, да таго ж яны маюць Герцагства Варшаўскае. А пра дзяржаву продкаў нашых акрамя нас, прадстаўнікоў мясцовых старадаўніх родаў, ніхто не

паруціцца. Мы, ліцвіны, спрадвечныя насельнікі гэтай зямлі, 500 гадоў мелі сваю дзяржаву. А цяпер акрамя нешматлікіх нас, якія па прычынах, вядомых хіба Пану Богу, праз падзенне Рэчы Паспалітай, праз паўстанне пана Тадэвуша, мала хто захаваў патрыятычную адданасць. Але прашу выбачыць... Пане пісару, напрыканцы пазначце маё імя, а таксама “Залессе, 1811 г.”

●

– Пане-браце, пакуль стаім у шыхце, маю навіну – палкоўнік Хлапоўскі не проста паставіў над нашаю ротаю літвіна, ён паставіў намі кіраваць літвінскае маладое дзяўчо!

– Палкоўніку раненне ў галаву зусім здароўе зварушыла. Панове, вы яшчэ не ведаеце, што палкоўнік надаў ёй званне капітана!

– Кажуць гэтая літвінка спявае простанародныя песенькі і выплясвае прасцецкія таньчыкі ораз піша вершы на сялянскай літвінскай мове!

– Сапраўды дзівачка. Але за якія заслугі яна мае столькі гонару?! Пан Франак, ты ваяваў на Літве, паведзь нам, прошэ.

– Яна стварыла і кіравала паўстанскім аддзелам на крэсах. Камандавала так паспяхова, што захапіла не адно мястэчка паміж Вітэбскам і Дынабургам, разбіла ахову генерала Шырмана і ледзьве яго самога ў палон не схапіла. А нядаўна штурмам узяла Вількамір. А яшчэ мае рэгулярныя мігрэні, тады лютуе жорстка – уласнымі рукамі душыць палонных імперцаў.

– А імя яе як?

– Эмілія, а назвіско запаментаў, ведаю хіба, што з нейкага нямецкага роду, які даўно асеў на Літве.

●

Крым, як лёгка тут дыхаецца. Усё цела сілкуецца і насычаецца марскім паветрам. Дзіўны гэты край, такія велічныя горы. І гісторыя паўсюль – грэкі, скіфы, татары, туркі, расійцы… Адпачывае тут шмат featнага люду – дваране, мяшчане, інтэлігенцыя, духоўнікі. Нямала і дзівакоў, вось як гэты, што ідзе па сцяжынцы, паэта расійскі, чорна-кучаравы, нібы мурын. Пільнуе мяне ў выцечках і пазірае гэтак дзіўнавата…

Як там край мой? Ці доўга будзе трываць здзекі шляхта, калі пачнуць ужо царскіх карнікаў класці па лясах?! Край мой, Айчына, не стае мне цябе, як і здароўя. Але толькі тут, у далёкім ад’ездзе разумею, што цябе немагчыма парааценіць. І толькі як страціш цябе, тады ўсведамляеш гэта. На такой адлегласці бачу харaство тваё ва ўсёй прыроднай аздобе. Я вельмі па табе сумую. І так усё жыццё…

Час сыходзіць з гары.

●

– Ісці па дамах і апартаментах і ўсім прапаноўваць квіткі.

– Пане Станіславе, артысты спалоханы, білеты прадаваць забаранілі, жандармы паўсюль цікуюць нас, хутка наогул зачыняць тэатр і забароняць прэм’еру. Такія самыя оперы ў Грэцыі і Бельгіі да паўстання давялі. Ой, даможамся мы арышту…

– Шаноўныя калегі, нам нельга адступіцца, гэта наш гонар і пакліканне – праз музычны тэатр будзіць павагу да нашай багатай культуры, да нашай славутай гісторыі, да літвінскага люду!

– Ой, пане Станіславе, тымі рамансамі, на народных песеньках заснаваных, Вы ўжо стварылі сабе такое “неблаганадзёжнае імя”… Можа лепей у Варшаве?

– Не, прэм’ера мусіць адбыцца тут. Менск першы пачуе “Сялянку”! Я адчуваю гэты выклік, ён пранізвае і ахінае мяне. Але ж, прыяцеле, час нам выходзіць… З цвёрдым сэрцам і Верай!

●

– Аристант, встаньте и отойдите к стене. Ваша еда. А вот Вам губернаторский отказ о замене казни на каторжные работы… Пане Вінцэнце, далей мушу шэптам. Вашыя допісы пераказаў, усе вельмі задаволеныя. Прасілі яшчэ. Кажуць Ваш зварот да сялянаў вельмі дарэчы. Але ж ці не апошні гэта твор, паночку, бо на пляцы ўжо шыбеніцу рыхтуюць… Хутка прыедзе ксёндз для апошняй споведзі. Вось тут маеце яшчэ атрамант, пяро і трохі паперы. Пішыце, людзі чакаюць. Але ж ледзьве не забыўся – вось лекарскія парашкі ад Вашых боляў… Увага! Ідзе наглядальнік і варта. Аристант, здавайте библиотечные книги!

– Выходим без вещей за стражей во двор!

Шэрае ліцвінскае неба. Шыбеніца, смяротны каравул. Пошчак барабанаў і зачытанне прысуду. Пад кожным словам ён мог падпісацца шматкроць – падбіваў, “оскорблял власть императора”, бухторыў, “давал нечаянные надежды низкому сословию”, аказваў супраціў, “покушался на государственное устояние”, узбройваў атрады “инсургентов”, бунтаваў, “препятствовал экспедиции начальствующих”, забіваў служылых казакаў, “собственноручно проводил пристрастные дознания офицеров”, стварыў сетку “неблагонадежной литературы”, “содействовал убытию от преследования политических преступников”, “с жестокостью прерывал работу

служителей”… Ваніты бралі ад гэтых чужых словаў. Як іхняя ўлада яшчэ пануе з такой брыдкай казённай мовай?! Маё пакаранне ім нічога не дасць, ужо тысячы крочаць па гэтым следзе.

Але адкуль гэтая прыязнасць да свайго? Дзе тая магутная крыніца – у якіх мясцінах? Ці часінах? Здагадка прымроілася і знікла, потым зноў праявілася ўжо бліжэй… Непераможаны дух зварушыўся і пачаў сыходзіць далёка, за тло нечаканай лёгкасці ў скронях…

●

– Алаізка, я проста замілавалася вершамі аднаго паэта! У ягоным зборніку ёсць паэма, напісаная паводле рэальнай гісторыі, што адбылася ў маёнтку недзе на Лагойшчыне. Гэта гісторыя няроўнага кахання з трагічным канцом. Слухай, там пакахаліся хлапец з дзяўчынкай, але ён з беднай сялянскай сям’і, а яна з багатага панскага роду. Яе брат спачатку вельмі шкодзіў ім, а потым, уяўляеш, увогуле забіў і нават спаліў хлопца. Дзяўчына не вытрымала і наклала на сябе рукі, а яе брат-забойца ад гора і віны звар’яцеў. Трагедыя стала расплатай за шчырае каханне і за яго руйнаванне. Дык, мне вось цікава, які ён, гэты паэт, як выглядае той чалавек, што напісаў такія кранальныя радкі?

– Зноў шляхецкая фанабэрнасць, колькі я наелася яе са сваімі братамі! Потым і ў Віленскай вучэльні, і ў Львове, і ў Кракаве. Ды, паўсюль! А ці апісана хоць ў тваёй паэме жыццё нашай вёскі?

– Тааак! Паэт вельмі рамантычна і, адначасова, рэалістычна выклаў высокія прынцыпы народнай маралі!

– Такія сюжэты вельмі прыдатныя для пастановак у Батлейцы. Але, Уладзя, жанр не новы, да яго яшчэ Дунін-Марцінкевіч і Багушэвіч звярталіся.

– Я і не кажу, што новы, проста так паэтычна, так пачуццёва, ды, па-беларуску і па нашых абставінах! Я такога яшчэ не сустракала! Аўтар гэтага твора мусіць быць добры, высакародны, а можа і прыгожы!!!

– Вось і напішы яму праз “Нашу Ніву”, калі не зазнаўся – адкажа. Дарэчы, здаецца, ведаю я твайго паэта, сустракаліся ў Пецярбургу.

– Праўда?! Алаізка, распавядзі пра яго, распавядзі!

– Не, вар’ятка, не час, адкладзі сваю мілосць, дай рады разгулу пачуццяў і збярыся з думкамі, бо нам цяпер важней справа нелегальных школак пад Лідай. Калі іх накрыюць жандармы, у дзетак не будзе адукацыі на роднай мове, а ў нас з табой не будзе анічога, акрамя вязніцы, камеры і баланды.

●

Ужо некалькі гадоў мінула з расійскай рэвалюцыі. Гэтая імперыя руйнуе сама сябе. Імперыя, у змаганні з якой пакладзена столькі жыццяў, паламана столькі лёсаў... Жудасная драпежніца з’ядае сябе знутры.

Гародня, ахутаны гісторыяй горад, улюбёны мой горад. Тут, мусіць і наканавана мне адыйсці да Бога.

– Пані, выбачаюся, тут скрутак з аптэкі, яго перадаў пан Нагорскі, а таксама ліст з Віленскага таварыства прыяцеляў навук.

– Эльжбэтка, пакладзі ўсё на стол. Дзякуй. Ідзі дзяўчо, мне трэба паразважаць… адной.

Дзіўны лёс мне падараваны. Кляштар, накладзены на маладое шаленства, шлюб з бедным Петрыкам, які без віны так пацярпеў праз маю безкампраміснасць. Змаганне, палітыка, пераследы. Раман з Рамуальдам. Шлюб з

Нагорскім. Калі Бог даў мне гэтае жыццё, то даў і магчымасць яго годна пракрочыць. Азіраюся і бачу мой падмурак, мае трывалыя слупы – народ, паўстанне, літаратура. Дзеля народу былі школы для простых дзетак, выступы за роўнасць кабетаў, клопат пра беларускую вёску, пра фальклор і духоўнае багацце сялянаў. Дзеля паўстання аддадзена нашмат болей – і грошы, і маёнтак, і маладосць. Дзеля яго было ратаванне Траўгута, клопат пра выжылых, ды і “Gloria vicis” дзеля яго. Але найвялікшым каханнем, ад усёй душы, была літаратура. Асабліва “Хам”. Нават усе намінацыі на Нобельскі дыплом не вартыя яго…

Насычаны, шчыры і аватунтурны лёс, варты пражыць яго зноўку і шматкротна!

●

Набыць сусветнае імя і знікнуць у Заходняй Беларусі. Мець выбар жыць у любой краіне свету і пераехаць у Вільню. Магчымасць добра зарабляць і рашэнне жыць сціпла. Творчы лёс дзеля мастацтва, але жыццё дзеля каханай і паспольства. Стварыць высока ацэненыя і сусветна прызнаныя эмацыйныя пейзажы, але займацца вырабам дэкарацый. Творца мае нядоўгі перыяд квітнення, за які ён выгарае і выкладаецца ўшчэнт. А потым нібы стаіць на ўкрайку разоры, адкуль рушыць альбо ў вір поўнага распушчэння ў творах, альбо ў асалоду сямейнага жыцця і грамадскай карысці.

А яшчэ заўсёднае служэнне праз шалёнае выплёскванне эмоцыяў на холст, адлюстраванне надрыўных жалобна-агрэсіўных сюжэтаў. Хацелася выклікаць у гледача такія ж моцныя перажыванні, якія меў сам. І менавіта мясцовае гераічна-змрочнае неба над самотнымі восеньскімі дрэвамі, якія адчайна гнуцца пад злым ветрам, ушчэнт вырываюць чалавека з мяшчанскае раўнавагі.

Мінула толькі 20 гадоў пасля Першай сусветнай, а немцы

пачынаюць ужо другую… Край мой заўжды між пажарамі, цяпер паміж фанатызмам нацыянал-сацыялізму і вар’яцтвам бальшавізму. Колькі яшчэ вытрымае між тымі драпежнікамі другая Рэч Паспалітая? Адвечнае жыццё на мяжы! Колькі эмоцыяў і пачуццяў! Вось чаму не магу з’ехаць адсюль, не магу збегчы з гэтага выбуховага жорнава. Хаджу ў творчым трымценні і кожны дзень адчуваю шалёную буру! Найлепшае асяроддзе для стваральніцтва!

●

У навучальнай майстэрні было ціха, усе працавалі моўчкі, быццам прадчувалі навіну:

– Сябры, у мяне кепская навіна: указам Сталіна адменены дзяржаўныя стыпендыі. Акрамя таго, што адмянілі стыпендыі, за навучанне будуць браць плату, ды такую вялізную, што можна параўнаць хіба з коштам каровы! Я асабіста не здолею далей вучыцца і мушу вяртацца назад да бацькоў, на вёску… Здам экстэрнам іспыты і выпраўлюся на Украіну, мо там нешта зараблю, а потым можа і ў Інстытут паступлю. А так хацелася займацца мастацтвам, так доўга пра гэта марыў і так шмат дзеля гэтага зрабіў!

– Васіль, ты таленавіты хлопец, ты знойдзеш сваё мастацтва. Можа не скульптура, можа не жывапіс, але абавязкова знойдзеш. Абавязкова, чуеш, не здавайся! Але хутка вайна, навокал усе пра гэта кажуць і ўсе да яе рыхтуюцца. Пэўна болей не спаткаемся…

●

Можа дарэмна адмовіўся збегчы ў Чэхію? Але ж тады не выратаваў бы Косціка Міцкевіча, ды і сваякоў бы арыштавалі. Якая крыважэрная гэтая ўлада, ніколі не даруюць мне той стары верш пра будучыню… А цяпер

адмыслова вырвалі з эвакуацыі, каб цкаваць чуткамі з акупаванага Менску. Няўжо там і сапраўды вуліцу маім імем назвалі?

Не мінае напружанае пачуццё небяспекі. Нібы забіўся ў кут і ўжо не вырвацца са смярдзючых "братэрскіх" абдымкаў... Ужо класава свядомыя заганялі ў гэты кут, і тады заставалася два выйсці – ці зламацца, ці пырнуць сябе нажом. Не трапіць у іх рукі, не паказаць сябе слабым і не ўзяць на душу грэх агавору. Зараз новая пастка...

На сёння прыніжэння досыць. Сустрэчы ў Саўнаркоме ў Былінскага ўжо не будзе, дарэмна чакаў. Стары іхні спосаб прынізіць – выклікаць і прымусіць без сэнсу чакаць увесь дзень. Ці перадумалі размаўляць са мной? Тады які іншы сродак гвалту абралі? Без шкоды ў спакоі не пакінуць. Усё, варта ехаць у гатэль. А ў якім мяне пасялілі? А, "Масква"! Нават гэтым паказалі месца... А наглядчыкі ў скураных паліто цікуюць ад самага ранку – з кім перамовіў, куды пайшоў, якую газету набыў? Няўжо і ў гатэль за мной паедуць?! Досыць... Не бачыць ім болей маёй ломкі, не будзе тых фальшывых дыфірамбаў і зацвілых партыйных фарсаў! Варта да скону мець гонар і пільнаваць імя!

●

– Ну, шо ты, бл.., упираешся? Ты уже никто, ты просто кусок мяса. Твой муж все подписал, все признал и за себя, и за тебя. Обосрался пару раз от страха, а так держался как интеллигент! Ты же еще молодая баба, может со своим Янкам еще детей нарожаете. Ну, конечно, после трудового искупления в лесах матушки Сибири. Если выживете. Бабам там тяжело. А семья твоя почти кончена – мамка и сестры в Казахстане померли, один брат в 44-м в Италии погиб, другой – в 45-м в Германии. Сынуля твой в братской народной Польше остался. Все, теперь тебе с нами жить... Бл..! Епт..., сержант! Она снова отключается! Лей воду!

Лупи по щекам! Сади ее на стул. Чево она там бормочет? Где архив, сука фашистская?!

– Можаце рабіць, што хочаце. Але я нічога сказаць не здолею, бо не ведаю, куды архіў павезлі. Меркавала, што траплю на допыт, таму загадала, каб без мяне хавалі, а самі зніклі… Усё, спадарове чэкісты, як у вас кажуць, абдзелаліcь! Я нават пад катаваннем нічога не скажу! Бо не ведаю! А вас брыдотных вылюдкаў ненавіжу да... да апошняй часткі душы, бо люблю Беларусь і гэта ўзаемна! Вам не зразумець, з якіх тое крыніцаў!

●

Цела прыемна дыхала. Чыстая белая кашуля лягла на плечы з рыпеннем крухмалу. Сонейка наўскос, ветрык у фіранках, за вакном птушкі… Чыстая папера на стале так неадольна вабіць! Мой улюбёны стол! Модныя шарыкавыя асадкі і звыклыя простыя алоўкі, і яшчэ некалькі плінфаў з Полацку.

Цыгарэта разняволіла. Як жа хочацца выпіць, сабраць адарві-рог кампанію і добра так, з адрывам і нахабствам напіцца, пакрычаць пад гітару ў парку і пайсці ў клуб да дзяўчатаў, а потым прыгодаў – сунуць у рыла якомусь нахабулу, збегчы ад нараду. А яшчэ хочацца ў вандроўку, містычную… Каб і гістарычна, і містычна! І шмат прыгодаў, насуперак усім “правільным” і заведзенаму імі парадку! Недзе ў стагоддзе 16-е!

Вакол нудзяць пра кепскае здароўе, шкодныя звычкі, пра смерць. Але якая яна – Смерць? Не тады, калі яе спалохана ўнікаеш, а калі нясеш на той свет зіхценне родных кветак, спеў неўміручых беларускіх жаўрукоў, нястрымны валацужны дух і жывыя зямныя асалоды.

Другая цыгарэта, яшчэ мацней захацелася выпіць… Як там учора ля крамы! Каб не наліў выпівохам віна, ніколі б у

жыцці не пачуў такія натхнёныя крыкі: “Вылівай! Вылівай!”

Адамік – сябра, сапраўдны і шчыры, але і ён, і астатнія мяркуюць, што сашлюць мяне ў санаторый і вырашаць маю і сваю праблему! Дзе там! Будзе як летась, зноў павыменьваю жалезныя рублі, буду плаваць праз возера да вёскі, жлукціць ля крамы пляшкі і плыць назад. Ну, ні разу ж не злапалі! Ахоўнікі! Хай зноў дзівяцца, скуль перад абедам, бавячыся на пустым пляжы, маю штодзень гарэзлівы стан! Святыя дурні, стрыманыя праведнікі!

Аднак, някепская ідэя пра выпіванне, пра Смерць і падарожжа на той свет! На той свет у п’яным стане! Насуперак правільнасці жыцця! Каб сваё вар’яцкае Сонца несці ў сабе нават у цемру забыцця! Гэтым варта трохі папсаваць паперу! Вядома ж, у патрэбным настроі і ў лепшым стане! Дзе там схоўчык?! Дзеля такой ідэі віно літаральна неабходнае!

●

У багажніку ляжаў яшчэ нехта, нерухомы. Падлога была ў ліпкім глеі, пэўна кроў. З галавы нешта густое пакрысе лілося на вочы. На купінах джып падкідала і галава суседа гучна білася аб падлогу. Куды вязуць? Не памятаю, чым скончылася тая бойка ў кавярні?

Ноч, лес, машыны. Іх выцягнулі і паставілі ля выкапанай пясчанай яміны. Суседам амаль безпрытомны, таксама з разбітай патыліцай. Умеюць жа, паскуды, з тылу падбірацца. Фары ў вочы, наперадзе байцы, пэўна “чорная брыгада”. Варта трымацца плячо ў плячо. Вось так з братам і загінем годна!

Нехта па-за машынамі ходзіць з мабілай, гучна з матамі спрачаецца, потым: “понял”. Сядаюць у машыны.

Ноч, лес, яма... і толькі мы ўдваіх. Прытомнасць сыходзіць...

●

– Отцепите их руки. Ее в эту машину, пацана в ту. Что? Да, ну на х…! Они лозунги кричали? Кого-то оскорбляли, флагами махали, сопротивление оказывали? Так, какого х… вы их сюда притащили? Эй, пацанята, вы кто ваще такие, какого болта вас сюда занесло, и чё в эту картинку вцепились? Ну, почему вам нормально не живется?! Сидели б дома, целовались там, сношались, жизни радовались. Не пойму вас. Что значит “па-іншаму не здольны”? Вот, вы откуда такие взялись, вы что, мутанты, или с другой планеты, или из какого паралельного мира? Все “здольны”, живут себе, учатся, работают, а вы “не здольны”! Родители у вас кто? Правильно, нормальные люди, а вы у них как такие повыростали? Ну, не подкидыши же! Мамка-папка-бабки-дедки по улицам с конём не ходят, и на языке нормальном говорят. Так откуда у них такие детки появляются? Эй, вызывайте скоряк, им сдадим! Какой, на х…, протокол, пусть медики их катают, пусть им мозги полощут!… Живей, олухи, а то до утра тут зависнем!… Капитан, пошли покурим.

– Вась, вот ты мне скажи, мы с ними что, разным воздухом дышим или бульбу какую-то другую едим? Б…, мне вот такие в армии жить спокойно не давали, надо было подрываться еще по ночи, броник хватать, ехать куда-то, мерзнуть в оцеплении. И только из-за того, что вот эти утырки где-то в кучу собрались! Я тоже историю люблю, книжки всякие читаю, нравится мне вся эта хр…нь – про князей там, про битвы, про княжество наше. В школе не любил, у нас историчка такая психическая была, что никто историю не учил. А у тебя?… Нууу, те повезло. Чё тогда после армейки в универ не пошел?… Аааа, это да, это важно, родители дело святое, и дети тоже, хоть и неожиданные!!! Светает уже. Ладно, братан, давай, удачи, это моё последнее дежурство, потом отпуск и переводят в

Молодечно. Хочу в универ на заочное поступить, на исторический. Карьеру по идеологии забацаю. Может годов через несколько в наше отделение с лекцией прикачу, мозги вам просвещать! Ты уже, наверно, майора получишь! Ладно. Как там у этих? Да пабачэння, сябра!

●

Стары цыганскі родавы пярсцёнак амаль не рухаўся на пальцы, але церабіць яго была старая звычка – калі паўставала патрэба ў цяжкіх ці глыбокіх развагах. Так было калісь з падаючай стралой, так было не так даўна і з Белай мышшу...

●

Палявы шэўрон паляцеў у сметніцу і лёг там на вельмі віднае месца. Вочы доўга не адрываліся ад яго. Колькі ўспамінаў. Але ехаць на Радзіму з такім шэўронам вельмі рызыкоўна.

●

У вачах пацямнела і яна ледзьве не звалілася. Выратавала плячо Аляксея, за якое атрымалася ўхапіцца ў апошні момант. Цяжка было выбірацца з дому і ехаць сюды, але сустрэча вартая і важная. Стан такі, што ні восеньскае сонейка, ні старыя сябры не ратавалі. А быць моцнай патрэбна, дзеля справы, у памяць бацькі і ўсіх... Усмешкі праз боль. Служэнне праз нягоды. Ідэя сярод абыякавасці. Трываласць дзяўчыны ля слабасці мужчынаў. Упартасць сярод безпрынцыповасці. І адкуль гэтая моц, невыказаная і незразумелая нават самой?

●

У іх не атрымлівалася завязаць кантакт з мясцовай расай, бо не існавала агульнай падставы дзеля паразумення. Ледзяныя развагі гасцей абсалютна не стасаваліся з сентыментальнымі ідэямі, якія віравалі ў свядомасці жыхароў гэтай планеты. Немагчыма было спасцігнуць мясцовы чын мыслення, насычаны прымітыўнымі пачуццёвымі каштоўнасцямі. Больш за тое, самыя пранікнёныя тубыльцы атачалі адну з атрыманых у спадчыну вербальных сістэмаў вобразамі блізкасці, сімваламі адданасці і вернасці, а таксама суправаджалі свае пачуцці абавязкам служэння ёй.

Госці мелі розум, глыбока і слепа абыякавы да нервовых узрушэнняў, таму чын мыслення, засмечаны эмоцыямі, выклікаў у гасцей агіду і няўхільна змушаў да высновы, што на гэтай планеце адсутнічае чысты інтэлект, а праявы разумовай дзейнасці выпадковыя і ажыццяўляюцца праз імпульсіўную логіку.

Згустак калектыўнага розуму гасцей карыстаўся думкавымі імпульсамі – нашмат вышэйшай формай дзейнасці за логіку. Яны маглі апынуцца ў любым месцы Сусвету і паглынаць веды любых цывілізацый. Ім, істотам, якія авалодалі часам настолькі, што маглі ствараць яго ў патрэбнай колькасці, была абсалютна незразумелая прымітыўная прывязанасць да такіх непадкантрольных субстанцый, як жарсць і апантанасць.

Адна з форм мясцовага эмацыйнага спасціжэння Сусвету – літаратура – апісвала свет у фантастычных вобразах, паводле якіх у будучыні жыхары планеты авалодаюць такімі першымі цывілізаванымі рысамі, як тэлепартацыя ў межах хаця б сваёй галактыкі. Але да сапраўдных тэхналогій яны не сягалі нават у сваіх марах.

Госці былі гатовыя дзяліцца з новымі расамі галоўным сакрэтам іх развіцця – спалучэннем канцэнтраванай

парапсіхічнай волі і адсутнага інтэлекту. Але такія эмацыйныя істоты, як тут, былі няздольныя вырвацца са свайго пачуццёвага сну, які здаваўся ім у вышэйшай ступені прыцягальным. Не было надзеі навучыць гэтую расу стабілізацыі касмічных целаў, стварэнню і ўдасканаленню жывых формаў, пераносу кропкі будучыні і вызначэнню кірунка эвалюцыі. Хаця бы прымітыўным формам парапсіхікі! Немагчыма, бо прадстаўнікі гэтай расы спазнавалі свет праз гульню вобразаў, праз перажыванне абыякавасці і спачування, нянавісці і любові, чужога і роднага… І выглядае так, што яны шчаслівыя ў сваіх бясконцых прымхах і ў сваім эмацыйным палоне…

Адна з прымхаў складалася ў тым, што жыхары гэтай планеты задаволена і самаўпэўнена называлі сябе ўладарамі жыцця, хаця адзіныя сапраўды разумныя істоты жылі тут у акіяне.

●

– Каханая, я далучыў цябе, транслюю цудоўны ранак і ўспамін пра нашыя будучыя шчаслівыя сумесныя гады! Сузірай праекцыю – мы сям’я, у нас было вяселле, мы чакаем дзетак!

– Я больш так не магу…

– Што не так?! Зноў у эфіры гэты руйнуючы нестрым! Я так і не навучыўся цябе разумець… Ты дзікая і невытлумачальная… Чаму ізноў патрэбна пераходзіць у цела, днямі глядзець на жудасны рэал, жыць успамінамі пра страты, насіць кучу змрочных энергій?

– Таму што хачу ўсё непрыхавана адчуваць і наяве перажываць усе эмоцыі!

– Адкуль у цябе такія памкненні, чаму ты жывеш у сваіх знешніх рысах? Куды рвецца твая неспакойная душа? Я досыць зарабляю, каб арганізаваць нам найлепшы выходны,

цудоўнае надвор’е, падарожжа, сумесны вечар з бацькамі, у любой частцы свету, не выходзячы з дому…

– Выбач, сыходжу з поля. І ведаеш… Мушу знайсці сабе такога ж ненармальнага рэала і ўлюбёнага ў тое ж самае…

– Сонейка, я люблю тое ж самае – краіну нашую, якую як заўгодна ствару і размалюю, гісторыю спраектую славутую, мову, музыку, культуру, тваю паспяховую кар’еру. І дамагуся прызнання цябе ва ўсіх гарызантальных і вертыкальных полісах!

– Хопіць, не хачу болей штучнай прасторы. Не хачу вірт-кахання і Радзімы ў праекцыі. Хай лепей жудасная праўда. Жывы недасканалы чалавек поруч і фізічная, змрочная, але сапраўдная зямля пад нагамі. Бо пачуцці не жывуць у вірце. Яны немагчымыя ў рухах думкі па сэнсару, але толькі ў рэчаіснасці і ва ўчынках!… Мне патрэбныя іншыя стасункі, з іншым чалавекам, іншага кшталту.

●

– Мамулік, а чаму ты нас вучыш вербальнай мове? Яна ж састарэла!

– Бо яе нам перадалі многія пакаленні да нас. Гэта скарб, гэта дар Боскі, як Радзіма, як маці, як каханне. Гэта тое, што мы ў жыцці не абіраем, а атрымліваем у падарунак і мусім гэты падарунак несці ахайна і ўрачыста.

– Бог, Радзіма, каханне – ты кажаш катэгорыі, якія ў садку не транслююць!

– Вось у гэтым і заганы вашай пачатковай адукацыі – усё толькі прымітыўна-тэлепатычнага ўзору. Не тое, што ў мінулых пакаленняў!

– А дзядуля і бабуля – гэта мінулыя пакаленні? Яны таксама ўжываюць толькі псіха-тыпы. А калі яны мінулыя, чаму

выглядаюць як ты і тата? А раней усе карысталіся голасам, калісьці не было нават тэле-топаў? А колькі пакаленняў было да нас? А гэтая мова старая?

– Дзеткі задавайце пытанні гукавой мовай! Яна вельмі старая. Вось вам усяго па 86 годзікаў, а нашай мове паўтары тысячы!

– А чаму тады іншыя не гавораць гукамі?

– Ну, дзеткі, людзі розныя бываюць, нехта слыху фізічнага не мае, нехта адукацыі добрай не атрымаў, нехта лайдакаваты, нехта можа маляваць толькі катэгорыі, але большасць людзей проста не адчувае патрэбы ў нечым большым, чым атрымалі з псіхапачаткам. Не даў ім Бог пачуцця свайго, роднага ...

– А ты маеш такое пачуццё? Адкуль ты яго ўзяла?

– Адкуль? Сама не ведаю... Усё, дзеткі, пара спаць, дабранач!

●

Гэта ўжо стала вельмі ўдалым бізнесам – бязмежныя ў часе сістэмы забеспячэння жыцця цела дзеля пастаяннага існавання ў віртуальнай прасторы. Усё болей і болей людзей пакідаюць рэальны свет і назаўжды сыходзяць у паралельную актыўнасць, застаючыся там да самой фізічнай смерці і нават пасля яе – наколькі доўга хапае запаветаных ці заробленых віртуальных грошай дзеля забеспячэння працы мозга. Іхнія думкі і ідэі існуюць там бясконца, бо ствараюцца ўсё новыя і новыя віртуальныя пласты, дзе можна падарожнічаць стагоддзямі. У віртуальны свет занесены самыя шчырыя перакананні і каштоўнасці, таму там утварыліся свае культуры і цывілізацыі, якія, як іх рэальныя папярэднікі, спрачаюцца і нават ваююць.

●

– Падмурак маёй праграмы грунтуецца на адным зразумелым і актуальным зараз прынцыпе – я патрабую поўнай і адкрытай ідэнтыфікацыі ўсіх без выключэння грамадзянаў! Патрэбна ў хуткім часе катэгарычна спыніць усе атакі на Ўніверсальную Грамадскую Сетку. Мы ўсе ведаем, што гэтыя атакі а-логікі арганізоўваюць ананімныя эмацыяналы – адшчапенцы, маргіналы, адасобленыя хворыя персоны, якія імкнуцца навязаць нам састарэлае нерацыянальнае права на асабістае, схаванае ад грамадства, жыццё, што ўшчэнт руйнуе самі падставы нашага каштоўнага, здабытага стагоддзямі і авеянага легендамі Супольнага Публічнага Ўладкавання. Дзеянні эмацыйных ананімаў падрываюць аўтарытэт Сусветнай рады і дыскрэдытуюць Глабальную Сістэму Кантроля, якая гарантуе устойлівым і лаяльным грамадзянам стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім спакойным ранку. Галасуйце за мяне і мы сумеснымі намаганнямі прывядзем грамадства да прадказальна-ураўнаважанага стану.

●

Ягонае палімернае цела не адчувала нічога, акрамя прыемнага забеспячэння інфармацыяй. Ён заўважыў невялікае пер’ечка, якое зачапілася за травінку і трымцела на ветры. Ён ужо пацягнуў руку, каб вызваліць пер’е з палону, але спыніла імгненна народжаная думка: не варта парадкаваць выпадковы збег жыцця, парушаць навакольныя акалічнасці і складаныя ўзаемадачыненні хаоса і прадвызначанасці. Як не варта выносіць меркаванне аб тым дзіўным урыўку інфармацыі, які нечакана патрапіў да яго праз пашкоджанае поле. Эмоцыі. Гэта было вельмі і вельмі непрыемным адкрыццём і страшэнным засмучэннем. З эмоцыямі было даўно скончана. І хаця часам знаходзіліся

прымітыўныя формы жыцця, якія спыніліся на эмацыйным этапе эвалюцыі, усе цывілізаваныя істоты, тым болей зканструяваныя імі паралельныя прасторы, ніколі не дапускалі стратнай хваравітасці адчування.

Што ж рабіць з гэтай несумненна моцнай вібрацыяй, якая грунтоўна прапісалася ў ягонай аналітычнасці?! Хвалявала не столькі ганьба сярод злучаных розумаў і віртуальных палёў, колькі чысціня мыслення, якая будзе непаўнавартай пры засмечанасці нават адной эмоцыяй. Яе нельга асуджаць, але і жыццядзейнічаць з ёй немагчыма. Цікава, што яна дасягнула яго не ў якасці псіхічных хваляў, а ў суправаджэнні састарэлай формы стасункаў – рэтраспектыўнага вобразнага мадэлявання!

У варунках абмежаванага поля, да таго ж недастаткова прасякнутага энергіяй, ён не мог прасачыць шлях развіцця вобраза і знайсці кропку паходжання акаляючай яго эмоцыі. Шматразова яму пачынала здавацца, што вось-вось адшукаецца адказ, але кожны раз з глыбіні кантрольнага блоку ўсплывала памылка з апісаннем нервовага ўзбуджэння і нават агрэсіі. Усвядомілася і нават пачала аналізавацца рызыка, што эмоцыя завалодае ягоным катэгарыяльным апаратам.

Унутры ішла ўжо сапраўдная барацьба. Несумненна, эмоцыя валодала паслядоўнасцю паводзінаў віруса, таму варта тэрмінова пачаць фарматаванне, якое, з іншага боку, дашчэнту знішчыць не толькі рэшткі віруса, але і актуальныя версіі інтэлекту. І раптам ён адчуў незвычайнае, дагэтуль немагчымае – эмацыйную барацьбу ўнутры, а потым прысутнасць нейкай таемнай гравітацыі, якая стаяла на варце пачуццёвага вобразу. Адзінае, што атрымлівалася высветліць – рамантызаванае паходжанне гэтага вобраза, які складаўся з распушчэння ў калектыўнай свядомасці…

●

– Перад тым, як далучыць Вас і пачаць пампаванне, мушу перасцерагчы – у новых кантрабандных розумах, якія не прайшлі ліцэнзію, ёсць living рознае смецце: урыўкі ведаў мінулых эпох, галасы даўно памерлых людзей, тэлепатычныя спрэчкі, тэксты нейкіх кніг. Могуць патрапіць і зусім непадкантрольныя рэчы – ідэалы, мроі, галюцынацыі і мары. Ёсць таксама рызыка, што разам з зададзеным вектарам пераўтварэння можна атрымаць нейкую рэтра-патрыятычную прывязанасць ці нават састарэлыя версіі шчырай веры ў Бога. Калі такая рызыка Вас не палохае, пачнем пераўтварэнне.

●

Аб’ява.

Я не папрашайка, а проста вельмі разнастайна накіраваная асоба. Я калекцыяную неўрозы. Пры гэтым, раблю захады да сур’ёзнага засцерагання – ізалюю ўжо назапашаныя і кантралюю арыгінальныя новыя. Запрашаю на сустрэчу ў планетарным полі ўсіх, хто з’яўляецца адданым калекцыянерам чалавечых неўрозаў для абмену і абмеркавання апошняй унікальнай і захапляльнай знаходкі – непераадольных, непрадказальных і незваротных зменаў псіхікі пад уздзеяннем асобна вымеранай масы неўратычных памкненняў да сумеснай энергетычнай вібрацыі над ідэяй свайго пераважнага адрознення ад сабепадобных істотаў.

●

– Далучай мяне як Яну. Гэта дагістарычнае імя часоў першапланетных цывілізацый і яно адпавядае маёй пара-зоне. Я больш не выходжу на іншыя імёны.

– Нам кажуць пра падлеткавую пратэстнасць, асабліва між 120 і 180-гадовым узростам. Але дзе ты магла гэта напаткаць?

– Выпадкова, у перыферыйным згустку натрапіла на часціню старадаўняга ілюзійнага падручніка гісторыі. Там адлюстраваны ранейшыя родавыя імёны. Гэта кшталту сучасных кодаў. Калісьці на адной першапланеце існавала месца, дзе плыні вадкасці цяклі ў супрацьлеглыя бакі і ўтваралі два супрацьлеглых моры, а потым гэтыя моры сустракаліся ў акіяне, адтуль выпараліся да нябёсаў, ліліся ападкамі і траплялі ў глебу і зноў пачаткавалі першыя плыні. Замыкалася энергетычнае кола зваротнай вадкасці!

– Адчуваеш перашкоды? Асцярожней, нашыя палі акрэсліў нейкі новы гарызонт. Ну, працягвай, што там распавядала пра колазварот?!

– Ты не ўяўляеш, якая вібрацыя сыцілася энергіяй таго кола! Зараз зафармую табе вобраз аднаго іхняга чыну стасункаў – паэзію. Гэта была вельмі дзіўная гульня. Жыхары той планеты апісвалі свае найскладаныя вобразы і напружаныя пачуцці праз простыя словы, а кожны чытач усё ствараў нанова і бачыў свае. Яны не разумелі адзін аднога – паэт і чытач. Паэт часам сам не ўсё разумеў у самім сваім творы. Вобразы пачыналі жыць сваім жыццём. Задумка твора рэдка супадала нават з эмоцыямі самога аўтара. Але ўсім падабалася такая гульня – аўтар пісаў, твор жыў сваім жыццём, чытач ласаваўся вірам думак і нараджаў новыя вобразы. Усе разумелі твор па-свойму, але былі задаволены! Зараз мы не валодаем такой эмацыйнасцю, таму ў Галактычнай бібліятэцы вісяць ужо спраектаваныя вобразы. Я не ўстрымалася і крыху насыціла іх сваімі фарбамі! Лаві:

*Мяккі і рухомы час пры заходзе зоркі*
*Абняў і лёг на высокія і нізкія расліны.*
*Каляровыя адбіткі роўнай вадкасці*
*Асцярожна з паветрам зацягваюць мае вусны...*

Паўзу спыніў ціхі, нібы шэпт, павеў ласкавых тэлепатычных эмоцый.

– Цывілізацыя даўно страціла тую планету, яна згубілася ў далёкіх прымітыўных напластаваннях. Але мяне працяла гэтая ідэя і я ўжо не магу ад яе адлучыцца...

●

Гістарычныя рэжымы катэгарычна адмоўна ставяцца да фантастычных тэорый, якія грунтуюцца на старых міфах. Паводле іх чалавецтва на золку эвалюцыі нібыта мела фізічныя формы, якія не карысталіся хаця бы простай палярнай энергетыкай, што чалавецтва нібыта зарадзілася толькі на адной планеце – недзе на ўзбочыне прымітыўнай галактыкі гравітацыйнага ўзору, што на гэтай планеце быццам існавалі адрозныя чалавечыя расы, якія асобна жылі на сваіх кантынентах, адарваных пластамі вады. Яшчэ больш неверагоднымі выглядалі міфы пра лакальную фізічна-эмацыйную прывязанасць людзей, якая прымушала ненавідзець і нават забіваць сабе падобных.

Сенсацыя прыйшла з археалогіі і адразу выклікала абурэнне. І не толькі гуманоідаў. Чалавецтва, якое даўно стала фактарам удасканалення прасторы-часу не магло ніколі жыць у такім варварскім стане. Таму навуковыя пастыры шмат якіх цывілізацый паставілі пад сумнеў арыгінальнасць і праўдзівасць новай археалагічнай знаходкі.

Па-першае, гэта былі рэшткі дагістарычнай тэхналогіі абмену інфармацыі праз рэтранслятары. Менавіта такі рэтранслятар невядомай расы гуманоідаў некалі выслаў паведамленне, злоўленае фільтрацыйным зондам, які вынырнуў у прасторы нейкай старой зоркі з даўно выпаленай планетарнай сістэмай.

Па-другое, атрыманыя ўрыўкі інфармацыі апісвалі

адасобленую кліматычную зону, якая не валодала ніякімі фізічнымі каштоўнасцямі і не мела ўзораў натуральнай прыгажосці, прызнаных эстэтычна развітымі расамі. Але жыхары той культуры былі здольны да пачуццёвага захаплення невытлумачальнай этымалогіі, якое валодала самапамнажальнай здольнасцю і давяло археолагаў, што дэшыфравалі яго, да хранічнага падрыву біяполя і прымусіла прайсці працэдуру катэгарычнага структурнага ачышчэння. Якое, зрэшты, не дасягнула жаданага выніку...

Ідэя калектыўнай прывязанасці да неэстэтычнага аб’екту – невытлумачальная на сучасным этапе развіцця цывілізацыі. Такія дагістарычныя формы сацыяльнай сувязі прызнаныя шкоднымі і даўно пераадолены. Цяпер кожны мабільна-зкантактаваны інтэлект уяўляе з сябе цэлы Сусвет з мэтанакіраванымі прынцыпамі па пераўтварэнню самых глыбокіх пластоў прасторы ў кірунку Сусветнай гармоніі.

●

Аднавіўшы ідэнтычнасць на невядомай планеце, новапрыбылы розум пачаў шукаць стабільную і адэкватную гэтым варункам форму. Даволі хутка ён пераўтварыўся ў амаль роўную сферу, крыху спрэсаваную згары і на доле. На тле дадзеных фізічных законаў такая форма дазваляла ажыццяўляць строгую разумовую дзейнасць. Форма хутка насыцілася мясцовай энергіяй. Невялікія намаганні дазволілі злучыцца з агульнапланетным полем, і пасля доўгіх бадзянняў па ягоных лініях, розум так і не знайшоў кропку адліку – агульную думку, ад якой можна было пачынаць выразнае разважанне. Поле было завалена ўрыўкавымі згадкамі з мінулага, аскепкамі інфармацыі пра развіццё думкі і тэхнікі... Асобныя блокі інфармацыі не стасаваліся між сабой, іх узаемасувязь рвалася экспрэсіўнымі алагічнымі паняткамі, якія абсалютна не паддаваліся ніякай строгай фармалізацыі.

Пасля некаторых спробаў атрымалася зафіксаваць дзіўны гістарычны кавалак – насычаны мараллю ўспамін пра непрыветны, але энергетычна густы перыяд гісторыі гэтай планеты. Розум шукаў рэтраспектыўны сэнс успаміна, але не знайшоў анічога, апрача ледзь улоўнага павеву шкадавання страты... Розум неахвотна развітаўся з ім. Ён глыбей прасякнуў у стужку часу і знайшоў там перыяд, дзе істоты, якія валодалі прасцейшымі спосабамі кантролю часу, спекулявалі на вандроўках па розных перыядах. А поруч знайшоўся і матыў такіх паводзінаў – нескладаная абстракцыя прыязнасці да нейкай групы істотаў, ад якіх выпраменьвалася бурлівая ўсепаглынальная хваля – неўсвядомленая, непадкантрольная інтэлекту, хаатычная, складзеная з жывёльных інстынктаў і першабытных перакананняў.

Ён паспрабаваў успрыняць гэтую абстракцыю і знайсці яе часавы пачатак, але наштурхнуўся на супрацьдзейсны фон. У той жа момант сфера пачала вібраваць і губляць гармонію. Толькі адхінуўшыся ад непраходнага фону, ён здолеў спыніць парушэнне формы. Розум не паспеў класіфікаваць гэтую абстракцыю, як раптам яна самаўладна заняла трывалае месца ў ягоным архіве.

З-за такога свавольнага пранікнення не атрымлівалася пабудаваць трывалы лагічны ланцужок, а без яго немагчыма было прасачыць эвалюцыю гэтай абстракцыі за больш-менш заўважны адцінак часу. Магчыма, гэта фантазія нейкага прымітыўнага калектыўнага розуму, фантазія, якая стала для яе носьбітаў міфам ці рэлігіяй. Розум ужо не хацеў губляць набытае, якое з-за сваёй неспасцігальнай прыроды станавілася асабліва прывабным і нават каштоўным.

●

Пераўвасабленне – рызыкоўны і небяспечны працэс. Страта

ідэнтычнасці нават на імгненне пакідае свядомасць абсалютна безабароннай, а працяглыя і шматразовыя пераўвасабленні бясконца павялічваюць сукупную працягласць існавання ў “забыцці”. Недаследаванасць гэтай часткі адкрытых вымярэнняў палохае ўсіх, але пры гэтым і вабіць катэгарычна. Усе здольныя да пераўвасаблення ведаюць пра тое, што іхняе “Я” праходзіць праз невядомую вобласць, але не могуць нічога з гэтым зрабіць, нічога прадбачыць і тым болей не здольны ацаніць вынікі і наступствы імгненнага знаходжання “там”. Усе чаканні заўважных вынікаў, якія можна было б прааналізаваць, цягнуцца неверагодна доўгі прамежак, а наступствы не праяўляюцца і не становяцца заўважнымі. Аднак усе ведаюць, а дакладней адчуваюць, што змены ёсць, што “прастора забыцця” не пакідае цнатлівым ніводны дух – ён становіцца цяжэйшым і засвойвае, уцягвае ў сябе частку “нечага”. Падазрэнні ў мэтанакіраваным уздзеянні “цёмнай вобласці” адкінуліся самі сабой, бо ўсе пераўвасобленыя не маюць агульных дэфармаваных ці набытых рысаў. Самыя магутныя аналітычныя канцэнтраты адступілі перад фактам унутранага адчування зменаў пры поўнай адсутнасці аб’ектыўных доказаў гэтых зменаў. Псіхоз назапашваецца. Пашырыліся паранаідальныя перакананні ў прыхаваным захопе ўсіх паралельных палёў адзінай таемнай “цьмянасцю”, якая не выказвае ні прынцыпаў, ні законаў, ні намераў. Магчыма, пакуль...

●

Ментальнае паходжанне. Зараз ужо цяжка вызначыць, калі яго адкрылі. Нашая невялікая планета спакойна ляцела разам са сваёй закінутай галактыкай. Якая роля магла быць выканана ёй? Якое адрыццё для разумнага жыцця? На тым этапе яшчэ ніхто не ставіў мэтаў па прасторавых падарожжах і даследаваннях. У нас панаваў абсалютны фаталізм. За ім тысячагоддзямі мы хавалі ўсе жахі і горшыя

перасцярогі. Але адкрыццё ментальнай радзімы перакрэсліла мінулае і дазволіла насыціць дзейнасць розуму неверагодна жывой інтэлектуальнай разнастайнасцю. Стала не важна, як выглядае тваё цела. Набор рысаў духоўнай памяці стаў галоўным вызначальнікам, асноўнай адметнасцю разумнай істоты. Пры сустрэчы ўжо не цікавіліся, як раней, фізічным. Пошук у далёкіх і блізкіх сусветах, прыстасаванне да сябе іншапланетных сродкаў мыслення, гарманічнае ці дыскамфортнае іх адчуванне – вось што стала крыніцай напружанага натхнення жыхароў усёй планеты.

З’явіліся першыя светлыя істоты, якія знайшлі сваю ментальную Радзіму. Знайшлі планету, энергія і памяць якой, незалежна, захавалася тая форма жыцця ці яе цывілізацыя даўно знікла, ідэальна супадала з лініямі іх поля. У светлых нарадзілася здольнасць дзяліцца роднымі вобразамі, формамі стасункаў, відамі гісторыі, і нават стэрэатыпамі, забабонамі і эмацыйнымі прывабнасцямі. Цікава, што некаторыя светлыя ішлі далей – пачыналі вучыць сваіх спадкаемцаў культываваць гэтыя вобразы. Утвараліся нават ментальныя генерацыі, якія звязвалі сваё жыццё з полем “сваёй” далёкай планеты. Некаторыя настолькі паглыбляліся ў іншапланетную памяць, што набывалі выразныя рысы даўно мінулых часоў, а таксама прымхаў, уласцівых гэтым часам. У адной з суполак такая адданасць была прымеркавана да невялікага рэгіёну на залітай вадкасцю маленькай планеце.

* * *

Сонца прабілася праз каляровыя вокны і асвятліла залу цырымоній. Маршалак земскі і паслы цярпліва слухалі дворнага і чакалі адказу князя.

– ...Грамата пісана ў замку Трокі, 27 кастрычніка 1430 году.

– Добра, на подпіс да Канцлера і рассылайце.

Ужо досыць вялікі час не адпускалі думкі пра ўсё перажытае, пра сходы манархаў Еўропы, пра заснаванне Каралеўства, пра вырак Папы, пра карону, паскудна скрадзеную палякамі. Пра першую жонку і двух сыноў, забітых крыжакамі. Пра бацькоў, забітых стрыечным братам. Колькі давялося даравацъ дзеля палітыкі, колькі разоў хаваць свае думкі і чакаць... Чакаць зручнага моманту дзеля помсты. Колькіх людзей пасласць на смерць ці забіць дзеля ўласнае ўлады – князёў і іхніх сыноў на Ворксле, дзяўчыну-выратавальніцу ў Крэўскім замку, тэўтонаў, татараў... А сваіх рыцараў і дружыннікаў, калі адабраў іх сыноў і дачок...

Дзе старыя мудрыя старцы, захавальнікі гісторый і знаўцы гераічных радаводаў?! Тыя, што ў немцаў завуцца герольдамі, а ў продкаў нашых былі апявальнікамі традыцый? Учора на піры гусляр нахабна праспяваў баладу пра падабенства майго лёсу з жыццём князя Усяслава Брачыславіча, які жыў тры стагоддзі таму. Народзіны ад валхавання, уздым дзяржавы, доўгачасовае ўладарства, двоеверства, уцёкі з Айчыны, страта пасаду і адваёва яго нанова, узнясенне славы між суседзямі, згадкі ў летапісах і спевах. Узгадаў гусельнік і маці маю, вайдалотку Біруту, якая служыла пры вечным агні, маці, якую ўсхвалялі за мудрасць ды яшчэ на гэтым свеце шанавалі як багіню...

Але болей за іншае непакоіла тая старая гісторыя з вядзьмаркай. Асабліва вабілі думкі пра паходжанне і першакрыніцы. Калі я заклаў ланцуг будучых увасабленняў, то хто заклаў маё, з якога ланцуга я сам?... А князь Бош Стары, а Рагвалод Готландскі, а Ўсяслаў Чараўнік, а Войшалк Руды, а мой дзед Гедымін Моцны?! А мой бацька?! Нееее, вядзьмарка! Ты засцерагала, але я хачу ведаць і не адступлю. Нават праз гэты раптоўны удар у скроні!... Хто я! Адкуль мае папярэднікі? Як хаця б на імгненне звярнуць

позірк у супрацьлеглы бок, у бясконцы вір мінуласці? Няўжо гэта...

Заняло дыханне, зкамянелі рукі. Млосны, стомлены сон... Свядомасць пакрысе выплыла з забыцця, цела не слухалася, але грэла толькі-толькі набытая радасць ад мрояў, убачаных па-за ускрайкам розуму. Стала спакойна, у душу пранікла трывалая раўнавага і гонар за прадзедаў. Вось і здагадка. Пераможца! Пальцы заварушыліся самі сабою, нібыта спрабуючы нешта ўхапіць – ці то прастору, ці то час, ці то зямлю, ці то стагоддзі... Скрозь далоні пацёк перамешаны ў адзіную плынь размаіты глей былога і наканаванага...

## СТАРЫ ОРДЭН

●

– Князю, яны ўжо злучылі орды трох ханаў – падольскага, крымскага і дунайскага. Маем занадта малое войска, каб супрацьстаяць ім. І толькі тваім светлым розумам тут не адолець. Вяшчун бачыў цяжкі сон пра цябе, стаячага ў чорнай вадзе...

– Ліст да Марыі ў Віцьбеск адаслалі?

– Так.

– Брату паведамілі, што не дапаможам з крыжакамі, каб сам трымаў іх?

– Так.

– На Амсціслаў падмацунак накіравалі?

– Так.

– Срэбра і сабалёў на хабары на захад адправілі?

– Так.

– Лоўчыя колькі вазоў з бочкамі засмалілі?

– 132.

– Прызначай канцэнтрацыю ля Пінска, ідзем на татараў.

●

– Пане, не варта ісці на штурм, зараз шыхтуемся для самай моцнай атакі, мы здольны яе паспяхова правесці без цябе.

– Не годна мне за насыпамі сядзець, калі мая дружына бярэ Баербург! Прагну славы! Кіньце ў пустым ядры за сцяну іхнюю грамату, хопіць чакаць!

– Пане, мы меліся дачакацца гарадзенскай харугвы!

Маршалак зрабіў крок наперад:

– Усе чулі?! Князь ідзе на прыступ, драбаў з раставымі тарчамі паабапал, пільнуйце арбалеты на сценах!

– Дружына павінна быць асаблівай. Набіраць з асельнікаў спаленых крыжакамі местаў і весяў. Каб былі злыя, нібы зімовыя ваўкі ці мядзведзі-бадзягі. Каб былі гатовыя рваць немцаў зубамі!

– Але як стрымаць лад у такой вар’яцкай дружыне? Хіба жорскімі захадамі. Каб не атрымалася як у апошняй абароне Наваградка. Ці як у паходзе пад Пскоў.

– Як там старая немка мяне праклінала – забіты будзеш на чужыне сваім паплечнікам нажом у спіну! Але ж такое ваяцкае паходнае жыццё – ніколі не ведаеш, дзе загінеш!

– Трэба памоцніць ахову.

– Мо і так, аднак, пабрацíме, абяцай, як бы ні здарылася, прывезці мяне і пахаваць ля Каложы! Недарма ж мы цэлы горад зруйнавалі і перасялілі сюды! Хачу спачыць пад каложскім храмам. Абяцай, як бы цяжка ні было, але не класці мяне ў чужой зямлі!

– Абяцаю.

– Да маркі Брандэнбурга далёка, невядома як там складзецца, але трэба паспрабаваць на конях уварвацца шпарка, каб немцы не паспелі зачыніцца ў замках. Каб выведка крыжакаў нічога не зразумела, мы нібыта едзем ад Гедыміна да Лакеткі, быццам дзеля стварэння ліцвінскай аховы пры ягоным двары. А там адным пераходам у галоп пад сцены Франкфурта. З Лакеткам умовімся, каб пусціў чуткі пра ахову.

– Пане кашталяне, гэты паход – найскладанейшая справа. Гэта не проста абарона Гародні, Полацеска ці Пскова, гэта не засады і пагоні, гэта не простае спаленне крыжацкіх замкаў... Гэта самая вялізная і жудасная абраза, якую немцы не забудуць ніколі!

– Вось, браце, менавіта аб тым і вядзецца! Паходы да межаў Прусіі ці на Рэвель – гэтага ўжо мала! Трэба зладзіць такі напад, каб усе зразумелі – мы не зайцы, каб гібець у разоры і чакаць чарговае навалы. Чаму б нам самім не хадзіць да немцаў і не паліць іхнія землі! Але ж вярнуся да пачатку размовы – патрэбны самыя злыя і шалёныя воі, каб гэтую дружыну немцы запомнілі надоўга! Шмат людзей не браць, недзе каля тысячы, галоўнае, каб былі дзікія! Патлумач ім, што ідзем не за рабункам, а каб абразіць і прынізіць – мужоў усіх секчы, а матрон і паненак паланіць і забіраць, асабліва знатных. А яшчэ трэба ўзяць лацінскага пісара, якога ў Прусіі схапілі, хай апіша ўвесь паход і дашле лістом храністу нямецкаму. Таму храністу, які самы знаны ў іх зараз – Петэр фон Дусбург.

– А як ордум трымаць у такой неспакойнай дружыне?

Будуць сваркі, асабліва за паланянак!

– Парадак пільнаваць даручы старэйшым пабрацімам, а каб сварак за немак не было, адразу папярэдзь – рознагалоссі вырашым дзелячы палон па-роооўну! Ну, ты ж ведаеш, як на роўныя часткі дзяліць!!!

– А што рабіць з палякамі, якія дабраахвотнікамі да нас запыталіся?

– Хто іх правадыр?

– Нейкі рыцар з Мазоўшы на імя Анджэй, кажа з роду Госта.

– Хай ідуць, але рознымі шляхамі, сустрэнемся на мяжы Брандэнбурга...

●

Дождж біў па лісцях, таму крокі вояў па лесе засталіся непачутымі.

– Нават ахова балюе, варту не выставілі... Бавяцца...

– Якія вырак, княжа?

– Дружыну, ахову, дворных і абоз – усіх рэзаць, не пакідаць жывым нікога. Самога вылюдка не чапаць, хай будзе ў розуме, хачу на яго вачах аднаго за другім рэзаць ягоных сыноў. Увесь род пад камель! Тууууут усе застануцца! Наперад!

...Наўскрайку лесу былі чутны енкі дабіваных дружыннікаў.

– Князю, старэйшага ягонага сына тут няма, толькі Рэпік і Рукля.

– Вядзіце іх. Зараз ты, стары злодзей, будзеш глядзець, як гіне ўся твая кроў! Дабяруся і да твайго старэйшага хітруна!

– Не чапай сыноў. Забі мяне, забірай княства, забірай скарб, але сыноў адпусці, Багамі заклінаю, не губі іх!

– Вось такія мольбы я табе і пасылаў, калі ты маю жонку схапіў. Абяцаў усё, абы адпусціў, пісаў табе пра нашае з ёй каханне. Але ты, стары пошаснік, яе зрабіў сваёй рабыняй! Яна табе ва ўнучкі прыдаецца, а ты яе на ложак!

– Тады дай сынам маім у рукі па мячу, хай патрапяць да Пяруна!

– Нееее, загінуць як бязродныя сабакі! А што, цяпер нашых багоў прыгадаў, калі ўжо трэба на неба ісці?!

– Даўмене, каханы, сыны ягоныя не пры справе, і абыходзіліся са мной добра, без абразаў, нібы з каралевай, адпусці іх!

– Табе спадабалася?! Колькі разоў рыскуны мае маглі вывезці цябе з Наваградку! Ты не паехала!

– Не хацела я вайны між вамі...

– А можа здрадзіла мне?! Можа княжной Вялікага княства сябе ўявіла?! Можа ўсе словы, што казала ў Крэве, былі падманам?! Вось зараз са сваім палюбоўнікам убачыце помсту. Жорсткую помсту. Трайнат, цягні першага сюды!

...Рукі, твар, уся каміза, нагавіцы і нават боты былі ў крыві. Дружыннікі пазіралі на князя і пераглядаліся між сабой. Ніхто не адважваўся яго спыняць, але жорсткасць была надзвычайная... І не над зарэзанымі сынамі вялікага князя, а над целам жонкі сваёй былой...

– А вось цяпер кіньце яму меч... Хачу, каб ты патрапіў на пір да багоў і каб я, калі скончыцца маё кола зямное, мог кожны дзень забіваць цябе там, кожны дзень рваць і рэзаць цябе за свой зганьбаваны гонар і за сорам жонкі маёй! І каб багі гэта бачылі! Ці ўжо нашым багам болей не служыш? Можа шчыра ўверыў у бога-жабрака? Карону ад папы хрысціянскага атрымаў, каралеўства заснаваў па іх узору,

біскупаў запрасіў... Нешта хочаш сказаць? Адпусціце яго.

– Скажу табе, вар’ят крыважэрны, што жонку тваю ніхто не чапаў, а каб ты пакутваў бясконца, мусіш ведаць – цяжарная яна была, тваё дзіця насіла. І засталася яна ў Наваградку сапраўды па просьбе маёй памёрлай Марты, і сапраўды хацела змірыць нашыя княствы. Бачыла, што з’ядуць ненасытныя крыжакі твае Нальшчаны, што толькі ў Вялікім княстве выратаванне нашае супольнае. Старэйшы сын мой збудуе тое, што бачылі і пра што марылі ўсе, і жонка твая таксама, усе, акрамя цябе, стратнага ў беспрытомнасці і бязглуздзі каханка.

– Ыыы... Сякеру мне, буду секчы яго...

●

– Прыйшлі ўсе, каго мы клікалі, і нават болей – віцебцы, аршанцы, менчукі, амсціслаўцы, эсты, латыголы, земгалы.

– Загадай летапісцу занатаваць, што ў лета 6724 сабралася вялізнае войска, каб пайсці ў вусце Дзвіны і знішчыць крыжацкае кубло дашчэнту. Ці гатова ўсё да выправы?

– Апошнія бочкі на стругі грузяць, потым заносім зброю. Паганцы ахвяры багам чыняць. Месцічы і духоўнікі не задаволеныя. Але спыняць ніхто не адважваецца.

– Хай моляцца таму, у каго вераць, бо на вайну ідуць... Замоў малебен у Сафіі, а пасля наладзь пір для правадыроў усіх дружынаў. Ды мёду і піва не шкадуйце, хай выправяцца ў паход з добрым настроем. І выкаціце нямецкую бочку, што з караблём адбілі. Сам уздыму першую славу тым віном!

Вечавы галосны зрабіў некалькі крокаў з натоўпа, наблізіўся да вежы і разгарнуў скрутак:

– Месцічы, баярства і асабіста князь Юрый Яраслававіч

запрашаюць мніха спыніць вычын стоўпніцтва, зруйнаваць мур вежавы і выйсці да люду, каб прыняць ганаровы пасад епіскапства, бо сваім жыватом сцвердзіў моц веры сваёй, выракся багацця, выканаў подзвіг пустэльніцтва, набыў бяспрыкладны аўтарытэт між усімі хрысціянамі, а златавуснымі сваімі казаннямі, малітвамі і павучаннямі заслужыў паўсельную пашану шчырую. Ад мніха нашага “Слова на Антыпасху” да яго ж чытаем усёй грамадой вечавай, каб адчуў нашае шанаванне ў вежы сваёй замураваны:

“Нынѣ деревья пускаютъ отрасли, и разцвѣтаютъ душистые цвѣты и разливаютъ приятное благоухание; и земледѣльцы, трудясь съ надеждою, призываютъ Христа, подателя плодовъ; такъ и мы были прежде какъ деревья лѣсныя, безплодныя, а нынѣ привилась Христова вѣра къ нашему невѣрию, и привитыя деревья, держась корня Иессеева и произращая цвѣты добродѣтелей, ожидаютъ новаго бытия въ раю Христовомъ; а равно и святители, и игумены, трудящиеся ради Церкви, ожидаютъ отъ Христа награды. Нынѣ словесный пахарь, налагая на словесныхъ тельцовъ духовное ярмо, и погружая крестное рало въ мысленныхъ броздахъ, и проводя борозду покаяния и посѣвая сѣмя духовное, веселится надеждою благъ будущихъ. Нынѣ все древнее закончилось, все стало новымъ ради воскресения. Нынѣ наводняются рѣки апостольския, размножаются рыбы словесныя, и рыбари, измѣривъ глубину Божия вочеловѣчения, находятъ церковную мрежу, полную улова. Нынѣ трудолюбрая пчела, обнаруживая свою мудрость, всѣхъ удивляетъ, изображая собою монаховъ; ибо и тѣ и другия, живя въ пустыняхъ, сами себя пропитываютъ, удивляютъ ангеловъ и человѣковъ и собираютъ съ цвѣтовъ медовый сотъ на услаждение человѣковъ и потребу церковную”.

●

– Прадславінка, ты такая шчаслівая! Да цябе ўжо сваты едуць, хутка станеш жонкай нейкага князя ці караля!

– А я не хачу станавіцца нічыёй жонкай. Дзяўчыны з нашага роду павыходзілі замуж за каралёў усяго хрысціянскага свету – чэшскіх, вугорскіх, нарвежскіх, дацкіх, французскіх. Павыходзілі замуж і з’ехалі на чужыну, засталіся непісьменнымі да скону і пераўтварыліся ў ціхія цені сваіх мужоў… І ведаеце, сёстры, я бачу толькі адзін сродак, як атрымаць адукацыю, застацца на Радзіме, прынесці карысць народу свайму, а таксама памнажаць духоўныя кнігі, навучаць дзетак, у тым ліку дзяўчынак, весці летапіс, пераконваць у мірным жыцці і пабожнасці. Гэты адзіны шлях – пайсці ў манастыр. Мая цётка – ігумення, я ўжо дамовілася, каб яна прыняла мой пострыг.

– Прадслава, гэта бунт супраць волі бацькоў!

– Так, бунт. Але вы – мае сёстры, і вы можаце пайсці са мной. Яшчэ я падмовіла пайсці ў манастыр разам са мной амаль тузін дзяўчынаў з баярскіх, дружынных і месцічавых сем’яў.

– Нашыя бацькі не згадзяцца. Сем’і нашыя, вядома, хрысціянскай рэлігійнасцю не вызначаюцца… Нягледзячы на княскі стан… Ваш з Гарадзіславай бацька ганарліва носіць язычніцкае імя Святаслаў, а хрысціянскае Георгій карыстае хіба для подпісу папераў. Тое ж і з маім бацькам Рагвалодам – толькі калі заснаваў места, толькі тады пайшоў на саступку царкоўнікам і ўзгадаў сваё хрысціянскае імя, назваўшы горад па імені ў хрышчэнні – Барысаў.

– Звеніслава, будзе цяжка. І нам і іншым знатным дзяўчынам. Але толькі так можна не распусціцца ў лёсе мужа і не знікнуць у чужым краі, назаўжды забыўшыся пра родны горад і нашую зямлю. Толькі праз манастыр, толькі праз вялізныя пакуты ў стасунках з роднымі можна застацца дома і выканаць пачэсныя намеры.

– Ты не хочаш дзетак? Не хочаш стаць мамай і бабуляй, трымаць у руках кавалак сябе і даць яму годнае жыццё?...

– Хачу, вельмі хачу, але яшчэ болей хачу варты лёс, які я абяру сама, а потым вырашу, дзе і як яго выканаць. Я хачу быць адукаванай і ўдзельнічаць у духоўным сталенні маіх людзей! І ні бацька, ні маці мне не зашкодзяць у гэтым моцным жаданні!

●

– Паднясі бліжэй лямпу. Неверагодна, тут скрутак! Як у такім сутарэнні яго не з’елі цвіль ці пацукі?! Хто вучаны чытаць?

“Слова пахвальнае… Няма згоды між верамі, а праз гэтае няма і адзінства ні люду, ні Княства. Цяжка шукаць паразумення між тымі, хто ненавідзіць адзін аднога. Ён будаваў хрысціянскія бажніцы, але не вынішчаў паганскіх. Адстойваў самастойнасць у паходах, але ўсяго 18 гадоў са свайго 70-гадовага жыцця. Браў дзідай Ноўгарад, Пскоў, Смаленск, але прысвяціў сябе не руйнаванню чужога, а стварэнню і ўмацаванню свайго. З року 6552 за 57 гадоў кіравання зрабіў княства шанаваным між блізкіх і далёкіх суседзяў – ад нарманаў да ляхаў, ад Ноўгарада да Кіева і нават да Царграда. І хай усе вінавацяць, што не духоўнае, а зямное штурхала яго біцца з супернікамі па марскім гандлі, але без ежы манах не здолее пісаць і маляваць, дойлід не збудуе храм, а ювелір не набудзе камянёў. Ягоны бацька, стары магутны валадар, выстаяў у нялёгкім змаганні з Кіевам і перадаў яму моцную спадчыну.

…меў спакусу і магчымасць атрымаць мацнейшы пасад у большым, але чужым княстве. Але гэта была для яго іншая краіна, наскрозь прасякнутая Візантыяй. Ягонае роднае палягала ў іншых абшарах – у лясах, туманах і ў моры Балта, ягонымі святынямі былі капішчы і варажба… Але і шанаванне Стваральніка не забываў ён – заклаў велічную

Сафію. Ягонае імя прыгадаюць нашчадкі праз сотні і тысячы летаў. Ягонае імя будзе вечна насіць вецер над нашымі замшэлымі камянямі...”

– Што змоўк, чытай далей!

– Вада размыла.

●

– Эй, Баян, а заспявай Сагу пра Эймунда!

– Князёўначкі мае дарагія, іх жа дзве. У адной апяваецца бітва між Полацкам і Кіевам, а ў другой Эймунд разам з Рагнарам скрадае Інгігерд?

– Вядома пра Інгігерд, нашто нам пра бітву, ты нам пра каханне спявай! Пра тое, як Інгігерд так памірыла Брачыслава і Яраслава, што яны разам кіравалі Кіевам і ніводнага разу не ваявалі ўсе 24 гады да смерці Брачыслава. Але важней пра таемнае каханне Эймунда і Інгігерд, як яны першы раз сустрэліся ў начым лесе, як Эймунд выкраў яе для Брачыслава ў якасці закладніцы, але сам закахаўся, як яны пакахалі адзін аднога і абыходзілі выведнікаў Яраслава, як Эймунд атрымаў вялізныя ўладанні, і Інгігерд ездзіла на спатканні да ягонага града.

– Спяваць па-нармански ці па-славенску? Па-нармански не памятаю як гучаць імёны Брачыслава і Яраслава, а па-славенску не памятаю як імя Інгігерд.

– Спявай па-нармански, гэта ў вас там у Кіеве ўсё па візантыйскай модзе, а ў нас паўночны край, нарманы навокал, нават не ведаю града ці гарадзішча, дзе іх няма! Пачынай – пра каханне па-нармански!

●

Як і калісьці было пад Пскова і ля Ноўгарада, усе дружыннікі па камандзе паскідалі рыштунак, выцягнулі з похваў кінжалы і паўторквалі перад сабой вастрыём дагары. Усе прашапталі закляцці і моўчкі звярнулі позіркі да неба ў чаканні, калі поўня выйдзе з-за хмары... Начны вецер гудзеў у голых галінах дрэваў, дудары чакалі з поўнымі мяхамі... А ўдалечыні за лесам блішчэў адбіткамі вогнішчаў паходны стан кіеўскіх князёў.

●

Залу запоўніў чарговы выбух гучнага смеху дружыннікаў.

– А скажы жрэц, твой Бог бярэ ў сваё Царства ўдалых рояў?... Не?! Толькі закаханых жабракоў і стрыманых рабоў?... А што робяць выратаваныя ў тваім Раі? Спяваюць і любяць? Дык, гэта ж Вальгала наадварот! А вось скажы, калі твайго Бога забілі рамеі, якім чынам і колькі разоў ён ім адпомсціў? Ніяк? Ён палюбіў сваіх забойцаў? Дзіўна... А з якімі багамі ён сябраваў, а з якімі ваяваў? Ні з кім?... Што?! Гэта неверагодна! Ты хлус! На нябёсах не могуць быць толькі ягоны Бацька і Дух? А астатніх багоў яны што, пазабівалі? Як астатніх не было? А нашыя багі, а багі славаў, готаў, рамеяў?

У залу ўвайшла князёўна. Дружына замоўкла, конунг узняўся. Князёўна цяжка прысела ў крэсла, трымаючы руку на жываце, агледзела чалавека ў жабрачым мяху пасярод залы і запытала:

– Хто гэты нябога?

– Вандроўнік, каралева, імя мае Торвальд. Пэўна, нарман. Вызнае толькі аднаго Бога – называе яго Адзіным і ўпарта цвердзіць, што астатніх няма і не было.

Чалавеча ў жабрачым мяху зрабіў крок наперад:

– Вы моліцеся ў пустыя нябёсы і ўся вашая вера падман.

У зале павісла цішыня. Князёўна пасміхнулася:

– Ты ці вар’ят, ці вельмі смелы, калі кажаш такое... Не, не трэба яго на ахвярнік. Хай ідзе далей, яго заб’юць у весях. І дакладна зробяць гэта ў гонар багоў і дзеля літасці іхняй... А зараз пакіньце нас усе і выганіце гэтага недарэку з града.

Грукат ног і бразгатанне кальчуг. Князёўна павярнулася да конунга:

– Хутка на свет з’явіцца нашае першае дзіця. Шаноўны, багамі мне прызначаны муж, едзь да вяшчункі, каб паваражыла на хлопчыка ці дзяўчынку і запытала ў багоў імя і лёс. Але гэтым разам кіруй да самай старой – выедзь праз паўднёвую браму Полгарда і па заходняй дарозе да святой крыніцы, там пакінь каня і дружыну і ідзі праз гушчар на поўнач...

...Косткі бразнулі на вуглі і ўзнялі гурбы іскарак. З шыпячым шкварчэннем на вуглях задымілася сэрца мядзьведзя. Праз колькі хвілінаў мармытання і шэптаў, вядзьмарка ўзвізгнула і замаўчала... Потым паволі ўзняла касматую галаву і з выдыхам прамовіла:

– Хлопчык. Але гэта вельмі рэдкія знакі. Бачу, трубіць у вялізны рог і валіць кашлатых вояў. Таму дай яму імя Рогвал. Ён адпомсціць у паўночных фіордах за твайго сваяка і завалодае землямі конунгаў. Ён дапаможа брату, твайму другому сыну, які будзе біцца як тур на поўдні і пабудуе горад у свой гонар. Рогвал пераможа ўсіх ворагаў Гардарыкі, але спасцігне смерць ад закаханага мсціўца. Бачу спаленне княства, забойства яго і ягоных сыноў. Ягоная дачка, твая ўнучка – яе назавуць таксама ў гонар ваярскага рога – паедзе праз няволю княжыць у Кійгард. Яе сыны, твае праўнукі, будуць вялікімі конунгамі на поўдні і на поўначы, але не здолеюць жыць мірна між сабою. Дочкі яе, твае праўнучкі, стануць жонкамі вялікіх уладарных каралёў і пачнуць славутыя роды. Бачу, твой унук, вуглі паказваюць імя Озас, вернецца на твае землі і пачне

вялізны род, які будзе кіраваць доўга. Праўнук тваёй унучкі будзе славутым конунгам-Чараўніком. Памяць пра тваіх нашчадкаў будзе на вуснах многіх пакаленняў і ў працягу бязлічных вёснаў... Я стамілася...

●

– Вандроўнік да князя Боша.

– Адкуль ён, якога народу?

– Кажа з Царова града. Яго перахапілі са світкамі, напісанымі па-рамейску. Распавядае, што ў Візантыі ведаюць пра твае, княжа, славутыя подзвігі – аб’яднанне плямёнаў, перамогу над готамі, нават пра стругавую бітву на Барысфене.

●

– Мы не можам проста так выйсці і пасяліцца за гарадзішчамі. Тым болей не можам загадаць гэта іншым родам. Гэта небяспечна. А раптам зноў нападуць па рацэ?

– Хай вайдалоты паварожаць на камянях, прынясуць ахвяру і скажуць, калі будзе наступная вайна.

– Паваражылі, вайны між намі больш не будзе. Сам Банца сабраў правадыроў і абвесціў пра звязак плямёнаў, а ў знак вечнага міру загадаў накаліць і загнуць рытуальны меч. Можам смела будавацца па берагах.

– А што рабіць з гарадзішчамі?

– Некалькі вёснаў будзем захоўваць у баявым стане, а потым, калі мір сапраўды працягнецца, зробім там сховішчы зерня.

– Але вайдалоты варажылі яшчэ на вясновых птушках. Яны ўбачылі, што прыйдуць да нас чужынцы, моцныя, ваяўнічыя

і прынясуць сваю мову, паселяцца між намі і будуць гадаваць з намі сумесных дзетак, а далёка наперад знітуемся з імі ў адзінае племя і нават пачнем на іхняй мове спяваць…

●

Вогнепаклоннікі і іх святары з’явіліся не раптоўна. Пра іх даўно прыносілі звесткі палонныя з паўднёвых плямёнаў. Яшчэ да новых святароў усе ведалі пра Вышэйшае Сонца і Усемагутны Агмень, ставіліся да іх з павагай, але старыя культы, духі, багі і продкі шмат каленаў спрыялі, ахоўвалі і лекавалі.

Вогневікі пераконвалі спальваць нябожчыкаў, а не хаваць, пераконвалі перад выпальваннем ляды чыніць ахвяры агню, а не духу лесу, пераконвалі прызнаць Сонца вышэй і мацней за Маці-нараджальніцу! Многія роды не прынялі новае веры. Пачалася вайна з тымі, каго ўжо пераканалі. І кожны меў святарнае апраўданне забойства аднапляменніка і шчырае перакананне ў перавазе сваёй веры…

●

“Ціра плыве з поўначы і пачынаецца з вялікага возера, якое служыць мяжой між Скіфіяй і Неўрыдай… Гэтыя людзі, відаць, ведзьмакі. Скіфы і жывучыя між іх эліны, прынамсі, сцвярджаюць, што кожны неўр штогод на некалькі дзён пераўтвараецца ў ваўка, а затым зноў набывае чалавечае аблічча”.

***Герадот, “Гісторыя”.***

●

Ведзьмары забаранялі наведваць і нават згадваць пра

могілкі былых людзей. Іх духам не прыносілі ахвяры, іх багам не пакланяліся. На думку ведзьмароў хадзіць там было небяспечна – можна было атрымаць хваробу праз гнеў нейкай стрывожанай душы. Рэчка падмывала бераг і могілкі паступова руйнаваліся. Разам са збялелымі косткамі з абрыву выпадалі старыя крамянёвыя сякеры. Былыя людзі былі настолькі дзікія, што нават не рабілі каменныя сякеры, не ведалі, як іх выточваць і як свідраваць адтуліны для асадкі.

●

Кошы з крамянёвымі камянямі перапраўлялі на дзяўбаных лодках. Той чужы прышлы род, што паспрабаваў пасяліцца на іхняй рацэ, навучыў здабываць крэмень глыбока ў зямлі. Гэта быў лепшы, якасны крэмень, а не той, што тубыльцы раней збіралі па беразе. З яго атрымлівалася вырабляць больш трывалыя і разнастайныя прылады і зброю.

Чужы род праз бойкі і напады выгналі са сваёй зямлі, а веды пра крамянёвыя шахты засталіся.

* * *

Бівень не паддаваўся, скураныя матузкі амаль не трымалі канструкцыю, халодны вецер напружваў усе вузельчыкі. Рукі мерзлі, старыя пальцы не слухаліся. Асабліва пад наглядам стольaccount маўклівых вачэй.

Жэстаў ужо не хапала і ён далучаў шмат гукаў, каб патлумачыць сваю цвёрдасць – ён не пойдзе нікуды з гэтых земляў, нават калі лёд захопіць усё навокал і касматыя жывёлы сыйдуць, ён усё роўна будзе біць у барабан і спяваць свае песні. І прапануе ўсім дужым і адданым багіні

Маці застацца з ім. Спяваць ля вогнішча, танцаваць вакол Святога дрэва і чакаць пацяплення. Яны дачакаюцца вяртання роду, яны самыя адданыя, непадобныя на іншых, будуць жыць тут…




# Зміцер Сасноўскі

Нарадзіўся 22.11.1974 у г. Гомелі. Бацькі: Алег Сасноўскі і Валянціна Хадановіч. Дзяды – Аўхім Хадановіч, Людміла Дворнік, Гурык Сасноўскі і Ніна Касцючэнка. Прадзеды – Ягор Хадановіч, Праксэда Хадановіч, Павел Дворнік, Марыя Лісоўская, Юзаф Сасноўскі, Анастасія Шыпінская, Іван Касцючэнка, Марыя Касцючэнка. Прадзед Юзаф Сасноўскі пад час акупацыі арганізоўваў школьніцтва, працаваў у грамадзянскай адміністрацыі, загінуў пасля вайны ў баі з атрадам НКВД. Увесь род паходзіць з Кармянскага раёна Гомельскай вобл.

Дзяцінства З. Сасноўскага прайшло ў вёсках Струмень і Лазовіца Кармянскага раёна. У 1981-1991 гг. навучаўся ў СШ № 44 г. Гомеля. Пасля Чарнобыльскай аварыі жыў з сям’ёй ў Латвіі (вёска Ліепушкі, раён Рэзэкнэ, Латгалія). У 1991 г. працаваў рэдактарам малатыражнай “Школьнай газеты”. У 1991-1996 гг. навучаўся ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны (гісторыка-юрыдычны ф-т). У 1992-1994 гг. быў старшынём Гомельскай маладзёжнай арганізацыі “Талака”. У 1992-1993 гг. наладжваў этнаграфічныя экспедыцыі па Ўсходняй Беларусі і Смаленскай вобласці РФ. У 1993-1994 гг. кіраваў

трэніровачным працэсам у Гомельскім аддзеле “БЗВ” (Беларускае згуртаванне вайскоўцаў).

У 1996 г. пераехаў у Полацк. У 1996-1997 гг. завочна навучаўся ў РІВШ (Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Менск, спецыяльнасць – філасофія). У 1996-2000 гг. выкладаў гісторыю філасофіі ў Полацкім дзяржаўным ўніверсітэце (Кафедра філасофіі і культуралогіі). У 1997-1998 гг. удзельнічаў у этнаграфічных экспедыцыях па Паўночнай Беларусі і Латгаліі (Усходняй Латвіі). У 1998 г. заклаў уласную калекцыю старых музычных інструментаў (частка падаравана Полацкаму краязнаўчаму музею). У той жа час пачаў рэстаўраваць старыя інструменты і вырабляць уласныя.

Увесну 1998 г. прайшоў стажыроўку ў Мадрыдскім каталіцкім універсітэце “Comillas” (Madrid University “Comillas”, programme Tempus/Tacis). Улетку 1998 г. прайшоў навучанне ў Латвіі ў музычнага майстра D. Vucis (хутар Маджуліс, раён Рэзэкнэ, Латгалія), заліковая праца – kokle (латгальскія гуслі). У 1999 г. стаў лаўрэатам (II-е месца) конкурса выканаўцаў на народных інструментах Міжнароднага фальклорнага фестываля ў Паставах.

У 1999 г. стварыў гурт сярэднявечнай музыкі “Стары Ольса” (8 альбомаў, 6 кліпаў, www.staryolsa.com).

У 2000 г. пераехаў у Гомель, працаваў выкладчыкам сусветнай мастацкай культуры ў СШ № 19 г. Гомеля. У 2000 г. асабістая калекцыя старых інструментаў З. Сасноўскага атрымала дыплом Міжнароднага фальклорнага фестываля ў Паставах.

У 2001 г. пераехаў у Менск. Працаваў прадзюсарам гастрольнага тура “Рок за перамены” гуртоў “NRM”, “Крама”, “НейроДюбель” і “ТТ-34” (арганізаваў 18 канцэртаў).

У 2001-2009 гг. працаваў загадчыкам Інфармацыйнага аддзела Згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына”

(zbsb.org).

У 2004 г. стажыраваўся ў Польшчы ў “Kolegium Europy Wschodniej” (Вроцлаў, праграма “Muzyka dawna”). У 2006 г. прайшоў стажыроўку ў ЗША (International Visitor Leadership Program/ United States Department of State).

З 2006 г. і дагэтуль – прадзюсар Міжнароднага фестываля “Дударскі фэст” (www.dudar.info). З таго ж 2006 г. – кіраўнік штогадовай Міжнарожнай канферэнцыі “Захаванне дударскай традыцыі ва Ўсходняй Еўропе”.

У 2006-2007 гг. працаваў рэжысёрам дакументальнага фільма “Старыя інструменты Беларусі” (“Early Instruments of Belarus documentary”; фільм атрымаў асаблівую адзнаку Фестываля этнічных культур у Філадэльфіі, 2008 г., ЗША). У межах здымкаў фільма ў 2007 г. наладжваў этнаграфічныя экспедыцыі па Паўночнай Беларусі. У 2007-2009 гг. працаваў адміністратарам Дударскага клуба Беларусі.

У 2008 г. выступіў у якасці прадзюсара пры стварэнні фольк-рок-гурта “LitvinTroll” (www.litvintroll.com). У 2008-2009 гг. прыцаваў прадзюсарам фестываля “Карнавал на Каляды”. У 2008-2010 гг. здымаў відэа-кліпы для гуртоў “LitvinTroll”, “Esprit” і “Стары Ольса”.

У 2009 г. заклаў прыватную калекцыю рэтра-аўтамабіляў. З 2009 г. – прэс-сакратар Таварыства рэтра-транспарта “Наша Перамога”.

З 2009 г. – арт-дырэктар Турыстычнага агенцтва “Гісторыя-Тур” (www.h-t.by). У 2009 г. працаваў на FM-станцыі “Авторадио” (аўтар і вядучы музыказнаўчай перадачы “Рэнесанс”). У 2009 г. удзельнічаў у культурным жыцці 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады (Уручча, Менск). З 2009 г. З. Сасноўскі працуе ў аргкамітэце фестываля “Гальшанскі фэст” (Ашмянскі райвыканкам).

**Выданні:**

Сасноўскі З. “Гісторыя беларускіх музычных уплываў”. Мінск, 2009, “Медысонт”. 138 с.;

Сасноўскі З. “Гісторыя беларускай музычнай культуры ад першабытнасці да канца XVIII ст.” Мінск, 2010, “Харвест”. 415 с.;

Сасноўскі З. “Музычная культура рыцарскага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага”. Мінск, 2010, “Беларускі кнігазбор”. 135 с.

Сасноўскі Зміцер, Orden Vita. Ордэн Віта, Беларуская Інтэрнэт Бібліятэка Kamunikat.org 2019

**Copyright © 2019 by Kamunikat.org - ePub**